**№ 9 (559)** 6 сакавіка 2008 **www.nn.by**

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд ... газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## У Расеі фарс без балагану

Расея арганізавана выбрала чалавека, на якога ёй паказалі. Краіна Мядзьведзева. **Старонка 3.**

### У НУМАРЫ

**Ціхая сапа Баршчэўскага**

Пасада кіраўніка апазыцыйнай партыі ў Беларусі — гэта пасада сьмяротніка. **Старонка 2.**

**Казулін працягнуў руку Лукашэнку**

Перад выездам у турму палітык даў прэс-канфэрэнцыю. Стэнаграма — **старонка 6**.

**Вэнэсуэла-Эквадор-Калюмбія**

будзе вайна, якая зацягне й беларусаў? **Старонка 8.**

**55**

гадоў таму памёр Сталін. А Казулін нарадзіўся ў 1955-м. Пра Сталіна і Казуліна піша Віталь Тарас. **Старонка 12.**



## Вярнуўшыся з Каносы

**Аляксандар Кульлінковіч атрымаў «Рок-Карону» з рук Уладзімера Арлова за свой альбом «Штазі». Старонка 18.**

### У Беларусь лятуць птушкі

У Беларусь аднымі зь першых вяртаюцца кнігаўкі. Мяккая зіма і адсутнасьць сьнегу даюць магчымасьць птушкам дачасна вярнуцца дамоў зь месцаў зімовак у Заходняй Францыі. Да канца лютага кнігаўкі былі заўважаны ўжо ў Стардароскім і Браслаўскім раёнах. Заўважаныя таксама гуменнікі, шэрыя гусі, палявыя жаўранкі; хутка прылятуць белыя сітаўкі і берасьцянкі.

**Паводле БелаПАН**



тэндэнцыі

# У Нясьвіжы, як у Парыжы, толькі вальней

У інтэрвію брытанскай Financial Times кіраўнік кампаніяў мабільнай сувязі Telekom Austria Group і Mobilkom Austria Барыс Немзіч паведаміў: «Да нас у Беларусі паставіліся нашмат лепш, чым у Брусэлі. Гэта не палітычная заява. Так заяўляе бізнэс».

Барыс Немзіч адзначыў, што «задаволены тым, як беларускія ўлады летась паставіліся да прапановаў кампаніі, калі яна набыла 70% акцыяў Velcom'у за 730 мільёнаў эўра».

Заява бізнэсоўца мела нагодай чарговую спробы Эўракамісіі абмежаваць расцэнкі апэратараў мабільнай сувязі. Брусэль падазрае, што міжнародныя роўмінгавыя зборы (плата за карыстаньне паслугамі замежнага апэратара) — гэта вымаганьне грошай з кліентаў, а ня вынік справядлівай канкурэнцыі. На мінулым тыдні Эўракамісія заклікала эўрапейскіх апэратараў скараціць роўмінгавыя выдаткі на SMS-паведамленьні і на мабільны доступ у інтэрнэт. На апошняй адмысловай канфэрэнцыі ў Барсэлёне на гэта нават вызначылі крайні тэрмін — да 1 ліпеня.

Прэс-сакратарка ЭК пад'ялдыкнула Немзіча: маўляў, ня ведаю, ад чаго яму бізнэс-клімат у Эўропе стаў не даспадобы, мо ад таго, што фінансавыя вынікі ягоных кампаній ніякаватыя. Нягледзячы на экспансію на ўсходніх рынках, іх кацiроўкі ўпалі на 10% за апошні год.

Прыклад Немзіча сьведчыць, што беларускія ўлады стараюцца паказаць сябе бізнэс-фрэндлі з заходнімі інвэстарамі. А некаторыя бізнэсоўцы радыя працаваць у аўтарытарных краінах: ані табе страйкаў, ані табе абмежаваньняў эксплюатацыі, ані мяжы прыбыткаў.

**Сямён Печанко**

### У Беларусі адмяняецца «залатая акцыя»

Новы крок эканамічнае лібэралізацыі: скасаваны інстытут асаблівага права дзяржавы («залатой акцыі») на ўдзел у кіраваньні гаспадарчымі таварыствамі. Адпаведны ўказ нумар 144 А.Лукашэнка падпісаў 4 сакавіка, паведамляе БЕЛТА. Адмова ад гэтай нормы будзе спрыяць прыцягненьню простых замежных інвэстыцый у прамысловасьць, а таксама павышэньню рэйтынгу Беларусі на міжнародным узроўні і абароне правоў інвэстараў, гаворыцца ў тлумачэньні. Указ уступіў у сілу з дня яго афіцыйнага апублікаваньня.

**БЕЛТА**

# Баршчэўскаму — 50

4 сакавіка споўнілася 50 гадоў старшыні Партыі БНФ Лявону Баршчэўскаму, вядомаму перадусім у якасьці грамадзкага дзеяча і інтэлектуала.

Сьвяткаваў юбіляр сустрэчай зь сябрамі, збольшага выкладчыкамі Беларускага ліцэю, — канфідэнцыйнай, «каб ня ўведаў амон», жартуе ён. Баршчэўскі сам зрабіў сабе падарунак на сьвята — 28-моўны беларуска-эўрапейскі слоўнік, які толькі што выйшаў ва Ўроцлаве.

Баршчэўскі, які ўзваліў на сябе кіраўніцтва Партыяй БНФ, выкарыстаў нагоду нарадзінаў, каб нагадаць пра палітыку. «Я рыхтую замену сабе, — заявіў ён у інтэрвію радыё «Рацыя», — і ствараю новае кіраўніцтва. Я разглядаю сем кандыдатур. І канчатковага выбару яшчэ не зрабіў. Дарэчы, абіраць новага кіраўніка партыі ўсё роўна будзе зьезд. Так што — пабачым», — захаваў інтрыгу ён.

**буг**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Ціхая сапа Баршчэўскага

Пасада кіраўніка апазыцыйнай партыі ў Беларусі — гэта пасада сьмяротніка. Яны навідавоку, іх ніхто ня любіць, па іх усе б'юць, ім няма ані опцыяў для манэўру, ані магчымасьці схавацца ад абстрэлу. Усенародны ўлюбёнец на гэтай пасадзе мільгам мяняе імідж на зьненавіднага бюракрата, грантасоса, кліента Вашынгтону, руку ФСБ — карацей, псэўдаапазыцыянэра.

Баршчэўскі зьдзейсьніў цуд: прыйшоў на пасаду кіраўніка партыі і ня траціць рэпутацыі грамадзкага дзеяча. Таму Баршчэўскаму — які ніколі ня піша пра справы партыі, а пра пытаньні нацыянальнага інтарэсу — адказваюць ад рэктара ВНУ да міністра абароны. Дыялёг, разгавор па сутнасьці, чорт пабяры! А Баршчэўскі сабе піша... Бо пісаць умее. Прычым, у адрозьненьне ад іншых партыйных бонзаў, не цураецца патачыць пяро і на інтэрнэт-форумах. Ён вылучаецца.

Баршчэўскі выгадна вылучаецца на агульным фоне, поўным разьдзяўбайства і расьсяроджанасьці — маўляў, па адзіночцы лягчэй выжываць на полі вялікае бітвы — таксама сваім дэманстратыўным упорам на парадак.

Ён настаяў на непапулярным, але, на ягоную думку, пільна патрэбным рашэньні аб умацаваньні ўнутрыпартыйнай дысцыпліны ў Партыі БНФ. Як настойваў на ўмацаваньні дысцыпліны ў Ліцэі.

Ён узяў на сябе адказнасьць за спрэчнае, але канечнае разьмежаваньне з «Рухам «За Свабоду», прычым зрабіў гэта неадкладна. Ён пасьлядоўны ў прынцыпах.

Ён не хавае і свайго «я» за звыклым беларускім «мы». «Я разглядаю сем кандыдатур. І канчатковага выбару яшчэ не зрабіў», — можа сказаць ён пра выбар наступніка.

Палітычная мудрасьць Баршчэўскага выяўляецца ў дэталях. Вось адмовіўся ён ад належнай па разнарадцы пасады сустаршыні бясконца бюракратычнага АДС — цяпер аказваецца, ён ашчадзіў купу часу і не зьвязаў рэпутацыі. АДСу — АДСава, БНФу — нацыянальныя інтарэсы. А пра іх варта нагадваць і генэралам.

Калі б у Беларусі існавалі рэйтынгі палітыкаў, рэйтынг Баршчэўскага паказваў бы сталы рост. Але рэйтынгаў у Беларусі не існуе. І сама палітыка трывае ў форме ўзаконенага дысыдэнцтва. Дзіва што Баршчэўскі паўтарае сакрамэнтальнае «я не палітык». «Я не паэта, о крый мяне Божа!» — пісаў у такіх выпадках Купала. Да пары.

**Барыс Тумар**



WWW.SVABODA.ORG

# Фарс без балагану

Расея арганізавана выбрала чалавека, на якога ёй паказалі.

Дзьмітры Мядзьведзеў перамог на выбарах з прадказальным вынікам: 70% галасоў пры яўцы, што склала таксама пад 70%. Некалькі псэўдаканкурэнтаў падзялілі рэшту пірага. Малалікая дэмакратычная апазыцыя правяла кароткія шэсьці пратэсту ў Маскве і Пецярбургу.

Застаецца пытаньнем, што новага ў палітыку Расеі прыўнясе новы лідэр рэжыму, які абапіраецца на спэцслужбы і дзяржаўныя сыравінныя манаполіі, у параўнаньні з Уладзімірам Пуціным, і ці ўвогуле будзе што новае? У дзень пасьля выбараў другі прэзыдэнт працягваў перад тэлекамэрамі знарочыста раздаваць заданьні трэцяму.

Калі ў замежнай палітыцы і размеркаваньні датацый унутры краіны павароты ўсё ж магчымыя, дык наўрад ці можна чакаць прынцыповых зьменаў у палітыцы Расеі ў Беларусі, якая вызначаецца інтарэсамі «Газпрому» і набліжаных да Крамлю нафтавых кампаній.

Паводле афіцыйных зьвестак, за Дзьмітрыя Мядзьведзева прагаласавалі 70,24% выбарцаў, за старшыню камуністаў Генадзя Зюганава — 17,75%, за Ўладзіміра Жырыноўскага — 9,36%, за кіраўніка створанай Крамлём фіктыўнае Дэмакратычнай партыі Андрэя Багданава — 1,30%.

Назіральнікі ад Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы назвалі выбары «крокам назад ад дэмакратыі», чым выклікалі гнеўную рэакцыю «расейскага Ярмошынай» — старшыні Цэнтравыбаркаму Ўладзіміра Чурава.

Перад выбарамі адсутнічала публічная дыскусія — Мядзьведзеў адмовіўся ад дэбатаў з канкурэнтамі, што стала ўжо традыцыяй постсавецкіх краінаў. Зрэшты, вялікіх дыскусій не было б і на дэбатах. Кандыдатам ад дэмакратычнай апазыцыі — Каспараву, Букоўскаму — наўпрост адмовілі ў праве балятавацца. «Канкурэнцыю» пераемніку Пуціна склалі тры прыдворныя кандыдаты, якіх толькі вялікі фантазэр можа лічыць сапраўды апазыцыйнымі.

Гэта лідэр камуністаў Генадзь Зюганаў, які выдае сябе за абаронцу інтарэсаў бедных і працоўных, але зашыўся быў у сваіх маскоўскіх кватэрах, калі пару гадоў таму ў Расеі ўзьнялася хваля пратэсту супраць адмены льготаў.

Гэта таксама Ўладзімір Вольфавіч Жырыноўскі, партыю якога стварыла КДБ у якасьці псэўдаапазыцыі яшчэ за часы СССР. Гэты майстар палітычнай сцэны на працягу ўсёй сваёй кар'еры трансьляваў ідэі Крамлю. Вяршыняй ягонай дзейнасьці быў 1998 год, калі ён уратаваў Ельцына ад імпічмэнту за разьвязваньне вайны ў Чачэніі.

Да іх гэтым разам дадаўся яшчэ кандыдат-«дэмакрат» — былы паліттэхноляг крэмлёўскіх партый, пэўны Багданаў. Гэты патлаты суб'ект зь непрыемнай фізіяноміяй выступаў у ролі «апазыцыі справа». Для поўнай праўдападобнасьці яго абралі яшчэ й вялікім магістрам масонскай лёжы...

Галасаваньне адбывалася спакойна, калі не лічыць шэрагу тэрарыстычных актаў у Дагестане. Найпершым клопатам выбарчых камісіяў было забесьпячэньне хоць якой яўкі, каб прэзыдэнцтва Мядзьведзева выглядала легітымна. Таму на ўчастках налівалі алькаголь і нават ладзілі лятарэі. Карацей, «выбары прайшлі арганізавана».

Нешматлікая дэмакратычная апазыцыя правяла ў панядзелак шэсьці пратэсту ў Маскве і Пецярбургу, што скончыліся затрыманьнямі двух дзясяткаў чалавек.

Расчараваньне і дэзарыентацыю недабітае расейскае лібэральнае інтэлігенцыі выказаў праваабаронца Сяргей Кавалёў, што сядзеў за свае палітычныя погляды яшчэ пры Брэжневе: «Пайсьці і прагаласаваць азначае ўзяць удзел у агідным спэктаклі хлусьні. Але застацца ўдома можа азначаць ухіліцца ад усякай спробы пратэсту супраць Крамлю». Кавалёў урэшце вырашыў пайсьці на ўчастак, але зьнесьці бюлетэнь з сабой на знак пратэсту.

Людзі кавалёўскага гарту наракаюць, што Расея мала

Працяг на старонцы 4.

### Смаленшчына прагаласавала супраць Мядзьведзева

У вобласьці на мяжы зь Беларусьсю кандыдат Крамлю атрымаў найменшы працэнт галасоў сярод усіх рэгіёнаў — 52,62%. «Адзіная Расея» на выбарах у Думу ў гэтым рэгіёне набрала ўсяго на 2% больш. Для аўтарытарнай Расеі такі нізкі працэнт фактычна роўны галасаваньню супраць.

У сярэднім у краіне Мядзьведзеў афіцыйна сабраў аж 70,23%. Мядзьведзеў таксама сабраў менш за сярэдняе ў Карэліі, Караляўцы (Калінінградзе) і Мурманску. Але не ў Пецярбургу, адкуль ён родам (72,27%), і не ў заможнай Маскве (71,65%). Імаверна, у рэгіёнах, што мяжуюць з цэнтральнаэўрапейскімі краінамі, на выбарцаў менш уплывае на прапаганду «посьпехаў пуцінскай Расіі» — вельмі адносных і ці трывалых.

# У Расеі цар заўжды быў адзін

Як вядома, Джордж Буш паглядзеў у вочы Пуціна і пабачыў у іх шчырую славянскую душу. Тады як Джон Маккейн у тых самых вачах выгледзеў толькі тры літары: К, Г і Б. У зрэнкі Мядзьведзева пакуль нікому не ўдалося нават зазірнуць. Таму ўсім застаецца гадаць і здагадвацца, якой будзе ягоная роля і палітыка.

Сьвет прыглядаецца да выбараў у Расеі з пагардай, але і прыхаваным спадзяваньнем, што недэмакратычна абраны Мядзьведзеў акажацца кіраўніком Расеі, здольным зразумець, што будучыня і Расеі, і навакольнага сьвету залежыць ад таго, ці стане Расея адкрытай дэмакратыяй. Ад таго, ці расейскія эліты будуць, як у XIX ст., лічыць сваёй задачай інкарпарацыю суседніх краінаў, а свае інтарэсы — супрацьлеглымі інтарэсам навакольнага сьвету. Ці наадварот, паставяць на інтэграцыю ў сусьветную эканоміку і павагі да свабоды індывіда.

Самі выбары 2 сакавіка большасьць СМІ не называе інакш як фарсам.

«Дэмакратычны рытуал быў да такой ступені дэвальваваны, што для многіх у Расеі стала ўсё адно, хадзіць на выбары ці не хадзіць», — піша нямецкая газэта Sueddeutsche Zeitung.

На думку гэтага мюнхэнскага выданьня, Мядзьведзеву будзе «ня так проста як Пуціну», бо хоць цэны на нафту па-ранейшаму зашкальваюць, дынаміка росту расейскай эканомікі горшае.

Француская правіцовая газэта Le Figaro пытаецца сабе, ці пуцінска-мядзьведзеўскі «тандэм пратрымаецца даўжэй, чым адну вясну: у Расеі традыцыйна месца было толькі для аднаго цара».

Тымчасам газэта францускіх бізнэсколаў Les Echos бачыць у Мядзьведзеву асобу ў традыцыі расейскіх палітычных марыянэтак, якіх у пераходныя пэрыяды вылучалі мацнейшыя гульцы, але якія ня мелі ў сабе якасьцяў для таго, каб стаць правадырамі.

Маскоўская газэта «Время новостей» перажывае, што выбарчы вечар «быў найнуднейшы ў сучаснай гісторыі Расеі». Апазыцыйная «Новая газета» піша пра імітацыю палітычнай барацьбы паміж Мядзьведзевым і трыма псэўдаапазыцыйнымі кандыдатамі, якія насамрэч усур'ёз ня ставяць пад сумнеў манаполію пуцінскай групоўкі на ўладу.

Чутныя ў сьвеце і больш аптымістычныя галасы. Гэтак, былы міністар замежных справаў Польшчы Адам Ротфэльд упэўнены, што ратацыя ўлады ў Расеі дае надзею на хай паступовыя, але перамены да лепшага, што «Мядзьведзеў будзе адыгрываць большую ролю, чым многія мяркуюць, і ня будзе ні марыянэткай, ні фікцыяй».

**МБ**

# Фарс без балагану

Працяг са старонкі 3.

зьмянілася ад часоў Мікалая I, калі краінай кіравалі агенты III аддзяленьня і Лермантаў горка пісаў: «Бывай, нямытая Расія, Край панства і сагнутых сьпін, І вы, астрогаў вартавыя, І ты, народ адданы ім».

Тым ня менш, ураджэнец Горадні Сяргей Кавалёў захоўвае спадзеў: «Я да дэмакратыі напэўна не дажыву [С.Кавалёву ў дзень выбараў споўнілася 78]. Але ня трэба занадта пэсымізму. Андрэй Сахараў у 1979 г. гаварыў, што не прадбачыць зьменаў у Савецкім Саюзе ў агляднай будучыні. Між тым зьмены пачаліся ўжо за пяць гадоў, а ў 1991 г. сама дзяржава СССР распалася. Цяпер сьвет разьвіваецца хутчэй, чым тады, дык хто ведае... Хоць сёньня здаецца, што расейская дэмакратыя — гэта справа хіба што 10—20 гадоў, можа, нам не давядзецца чакаць аж так доўга», — сказаў ён у інтэрвію польскай «Газэце выборчай».

**Мікола Бугай**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Як тое нам знаёмае…

3 сакавіка ў цэнтры Масквы, на Чыстых Прудах, здавалася, увялі ваеннае становішча. Стаяла вайсковая тэхніка, тоўпіліся камуфляжныя людзі.

Каб высьветліць абставіны, я падышоў да аднаго з прадстаўнікоў сілаў правапарадку, назваўся журналістам зь Беларусі і, як немасковец, выказаў зацікаўленасьць, што тут адбываецца. На што пачуў адказ:

— Рыхтуемся да выступу самадзейнасьці.

— А што за самадзейнасьць такая?

— Творчая. Сьпяваць будзем ды танчыць.

— А, то можа гэта зьвязана з учорашнімі выбарамі? Сьвяткаваньне будзе?

— Ага, будзе. Маладыя міліцыянты вунь ужо прыплясваюць, — хмыкнуў мой суразмоўца.

Тлумачэньне, вядома, дзіўнае. Тым больш з боку чалавека ў форме, які адмовіўся назваць сябе.

Як тлумачэньне такой мабілізацыі больш пасуе ў дадзеным выпадку тое паведамленьне, што 3 сакавіка а 17-й у Маскве меў адбыцца «Марш нязгодных» — акцыя, арганізаваная апазыцыйнай кааліцыяй «Іншая Расея». І збор удзельнікаў прызначаны менавіта на Чыстых Прудах. Маскоўская мэрыя адмовіла ва ўзгадненьні «Маршу нязгодных», ніяк пры гэтым не матывуючы сваё рашэньне.

У Пецярбургу таксама меў адбыцца «Марш нязгодных», які, у адрозьненьне ад маскоўскага, быў санкцыянаваны ўладамі. Каб узяць удзел ў ім, у паўночную сталіцу Расеі прыляцелі лідэры «Іншай Расеі», вядомыя апазыцыйныя дзейсnаму рэжыму палітыкі Эдуард Лімонаў і Гары Каспараў. Таксама мітынгі ў падтрымку «Маршаў нязгодных» заплянаваныя больш як у 10 рэгіёнах Расеі.

Нагадаем, што 2 сакавіка ў Расейскай Фэдэрацыі адбыліся выбары прэзыдэнта. Паводле папярэдніх зьвестак, перамогу атрымаў Дзьмітры Мядзьведзеў. Пасьля падліку 99,45% бюлетэняў, ён мае 70,23% галасоў выбарцаў.

Галоўнае пытаньне, якое хочацца задаць уладам (усё тым жа, пуцінскім, бо зьмена ўлады наўрад ці адбудзецца пры «пераемніку»): калі новаабраны прэзыдэнт мае абсалютную падтрымку насельніцтва краіны (тут трэба адзначыць, што падтрымку як мінімум большасьці той мае), а апазыцыя прадстаўленая, як заяўляецца, маргіналізаванымі групамі, то навошта тады спатрэбілася выводзіць войскі ў цэнтар сталіцы Расеі супраць купкі нязгодных? А можа, усё ж такі ёсьць чаго баяцца? Баяцца, што нешматгалосы крык неабыякавых ды нязгодных будзе пачуты...

Гэх, як тое нам знаёмае...

**Юры Алейнік, з Масквы**

# Асобы лютага

Выбар відавочны — **Аляксандар і Ірына Казуліны.**

15 лютага ў Віцебску Аляксандар Лукашэнка заявіў, што прапаноўваў палітвязьню Аляксандру Казуліну вызваленьне ў абмен на выезд з краіны ў Нямеччыну. Лукашэнка сказаў: «Наколькі я інфармаваны, гэтая пазыцыя ня ўстроіла аднаго Казуліна. Пытаньне было ў тым, што ягоная жонка хворая, і да мяне зьвярнуліся паслы Эўрасаюзу... Я згадзіўся — хай вязе, лякуе жонку. Але наколькі ранкам я быў інфармаваны, ён адмовіўся яе лекаваць. Але гэта сямейныя праблемы, адмовіўся дык адмовіўся. Ён адмовіўся нават пасьля таго, як ягоныя дочкі паехалі і ўгаворвалі ўратаваць маму, яму гэтая мама ўжо даўно не была трэба... Але я не хачу ўлазіць у чужыя дзялы, жыцьцё ўсе расставіць па сваіх месцах».

Сьмяротна хворая Ірына Казуліна знайшла ў сабе сілы адказаць на гэтыя словы адкрытым лістом. Яна ўжо не магла гаварыць, але пісала: «Зачапіла за жывое грэблівае стаўленьне да нашай сям'і. Хоць часам здаецца, што нічога падобнага ўжо ня можа вывесьці зь сябе, цынізм дзівіць. Тыя прапановы, якія былі агучаныя ягоным пасланцом нам, былі непрымальнымі. Гэта было б ганебнымі ўцёкамі з краіны».

23 лютага Ірына Казуліна памерла. Адміністрацыя калёніі доўга не хацела выпускаць А. Казуліна на пахаваньне жонкі. Але пакутніца-жанчына абудзіла такую хвалю грамадзкага спачуваньня і абурэньня, што ўлады ўрэшце былі вымушаныя адшкадаваць палітыку тры дні адпачынку.

Разьвітацца з Ірынай Казулінай у Чырвоны касьцёл і на могілкі ў Тарасава прыйшлі некалькі тысяч чалавек. Гэтая жанчына стала ўвасабленьнем і сымбалем усіх пакутаў, якія выпадаюць на долю сваякоў беларускіх палітвязьняў.

Перад самым вяртаньнем у турму Аляксандар Казулін сказаў: «Я дарую Лукашэнку, мая сям'я дарує яму. Я працягваю руку да Лукашэнкі з абсалютна чыстым сэрцам і намерамі. Я прапаноўваю яму забыцца на ўсе асабістыя крыўды».



**Гебхарт Вайс.** Сэпаратныя перамовы нямецкага пасла з Лукашэнкам скончыліся вызваленьнем шэрагу палітвязьняў. Цягам лютага на волі апынуліся Артур Фінькевіч, Андрэй Клімаў, Аляксандар Зьдзьвіжкоў. Стала відавочна, што афіцыйны Менск праводзіць нейкія перамовы зь Нямеччынай. Казаў пра ролю пасла Вайса і А. Казулін: «Я магу сказаць, што нямецкі пасол Вайс дзейнічаў сумленна. Ён шчыра хацеў нам дапамагчы. Тое, што было потым, — іншая гісторыя. Разумееце, немцы часта не разумеюць нашу рэчаіснасьць і нюансы, якія вельмі важныя».

**Андрэй Хадановіч.** Культурны голад, які ўтварыўся ў выніку забаронаў на беларускую культуру і друк, у лютым спаталяў Андрэй Хадановіч падчас прэзэнтацыі новай кнігі вершаў «Бэрлібры». На імпрэзу прыйшло некалькі соцень чалавек. Усе ахвотныя нават не змаглі зьмясьціцца ў тэатральнай залі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Хадановіч мае неаспрэчны талент і папулярнасьць і дае прыклад творчай і грамадзянскай нястомнасьці.

**Уладзімер Здановіч.** Дэпутат палаты прадстаўнікоў Уладзімер Здановіч, які кардынуе распрацоўку новага закону «Аб правілах беларускай артаграфіі і пунктуацыі», заявіў проста, для каго прымаецца закон аб кропках, косках і вялікіх літарах у слове Прэзыдэнт: «Пасьля прыняцьця закону «Наша Ніва» і ARCHE павінныя будуць кіравацца зацьверджанымі правіламі». Словы Здановіча супярэчаць ягоным жа заявам месячнай даўніны, дзе парлямэнтар выказваў зусім іншыя думкі: «Нельга чалавеку забараніць размаўляць і пісаць на той мове, на якой ён хоча. Калі хтосьці чытае газэту «Наша Ніва», часопіс ARCHE, дык наўрад ці іх будуць забараняць». Характэрна, што радыкальныя зьмены ў закон былі ўнесеныя перад другім чытаньнем, безь ніякіх нават кансультацый з навукоўцамі.

**Косаўскія альбанцы.** 17 лютага на палітычнай мапе сьвету паболела на яшчэ адну незалежную дзяржаву. Парлямэнт Косава аднагалосна прагаласаваў за абвяшчэньне незалежнасьці краю ад Сэрбіі. Косава пачало барацьбу за незалежнасьць у 1970-я, калі край нават ня меў дзяржаўнага статусу ў былой Югаславіі. Агмянём нацыянальна-вызвольнае барацьбы быў унівэрсытэт Прышціны, а маральным лідэрам руху — нядаўна памерлы філёзаф Ібрагім Ругова. Хаця касавары і абвясьцілі незалежнасьць, пытаньне, ці стануць яны нацыяй, застаецца адкрытым.



**Антон Кушнір.** Наймацнейшая ў сьвеце беларуская школа фрыстайлістаў-акрабатаў займела яшчэ адну зорку — Антона Кушніра. 23-гадовы мянчук ідзе другім у агульным заліку Кубку сьвету, саступаючы толькі канадзкай легендзе фрыстайлу Омішлю, і апярэджваючы славутага суайчыньніка Дашчынскага. У лютым Кушнір выйграў першы тытул у сваім жыцьці.

**Зьміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Казулін працягнуў руку Лукашэнку

Перад выездам назад у калёнію «Віцьба» Аляксандар Казулін даў прэс-канфэрэнцыю у сядзібе інфармацыйнага агенцтва БелаПАН.

Казулін быў абмежаваны ў часе, таму кантакты з прэсай былі сьціснутыя да паўгадзіны. На пытаньні палітвязень адказваў па-расейску.

Пачаў А.Казулін зь невялікай прамовы, дзе акрэсьліў сваю пазыцыю па шэрагу пытаньняў.

«Я выйшаў з прапановай да ўсіх дэмакратычных сілаў падвесьці рысу, забыцца на ўсе свае нейкія асабістыя крыўды, зразумець, што дзяленьне ўжо скончылася. Усе мы мусім аб’яднацца для перамен, час гвалту, вайны і тэрору канчаецца. Я выступіў з ініцыятывай аб’явіць 2008 год годам Беларускай Народнай Рэспублікі, у нас, у Эўропе, у сьвеце. Я выступіў з прапановай аб стварэньні не аргкамітэту АДС, а народнага камітэту па сьвяткаваньні 90-годзьдзя БНР. Таксама паппрасіў апазыцыю заявіць, што сёлета мы правядзем Кангрэс усіх дэмакратычных сілаў Беларусі. Гэты Кангрэс ня можа быць месцам разборак, а павінен быць прысьвечаны будучыні нашай краіны, яе месцы ў сьвеце, стасункам з нашымі суседзямі, ЗША, Эўрасаюзам, Расеяй. Нам ня трэба на Кангрэсе патрабаваць нейкіх справаздач і апраўданьняў ці высьвятляць, хто з нас найлепшы. Я прапанаваў, каб на Кангрэс была запрошаная Рада БНР на чале з Івонкай Сурвіллай. Таксама зьвярталося да грамадзкай арганізацыі «Бацькаўшчына», каб яны таксама ўвайшлі ў склад народнага камітэту, і паспрыялі, каб беларусы сьвету прыехалі на гэты Кангрэс. У Кангрэсе мусяць узяць удзел ня толькі палітыкі, але і пісьменьнікі, і моладзь, і прадпрымальнікі», — адзначыў А.Казулін.

У часе прамовы палітвязень таксама зьвярнуўся да А.Лукашэнкі: «Сёньня я прачнуўся крыху іншым чалавекам. У маёй душы наступіў спакой. Гвалт не прыводзіць ні да чаго добрага, я гэта заўсёды ведаў. Я дарую Лукашэнку, мая сям’я даруе яму. Магу толькі сказаць, што нельга пераступаць празь сьвятыню, за сьвятыню змагаюцца і перамагаюць, але яе не абражаюць. Я працягваю руку да Лукашэнкі з абсалютна чыстым сэрцам і намерамі. Я прапаную яму забыцца на ўсе асабістыя крыўды. Нягледзячы ні на што, ён частка гісторыі не-

залежнай Беларусі. Я заклікаю яго падняцца над асабістым і стаць сапраўды прэзыдэнтам Беларусі, а не звычайным сьмяротным.

Лукашэнка чалавек са сваімі жарсьцямі і эмоцыямі, пара яму стаць прэзыдэнтам. Падняцца над нізкім і паказаць усё сьветлае, што ёсьць у кожным чалавеку, і, канечне, ёсьць у Лукашэнку. Я прапаноўваю яму забыцца на мінулае і пачаць усё з чыстага аркуша. У Лукашэнкі ёсьць сёньня выбар — прыняць маю прапанову і пачаць новы этап у разьвіцьці Беларусі».

Таксама А.Казулін акрэсьліў сваё бачаньне геапалітычнага выбару Беларусі: «Калі мы гаворым пра Расею, то нельга паліваць брудам вялікую краіну, у захаваюцца і будуць асаблівыя стасункі з Расеяй, аднак наша будучыня ў Эўропе і Эўрасаюзе».

Пасьля выступу журналісты мелі магчымасьць задаць пытаньні.

**— Як у калёніі ўспрынялі навіну пра сьмерць Вашай жонкі?**

— Асуджаныя паставіліся зь вялікім жалем і спачуваньнем да мяне. Кіраўніцтва таксама праявіла чалавечнасьць.

**— Вы гатовы стаць на чале дэмакратычных сілаў?**

— Калі кажуць, што нехта гатовы стаць лідэрам, я ўзгадваю Пятра Краўчанку, які сказаў, што гатовы стаць нацыянальным героем і лідэрам. Не чалавек рашае, а грамадзтва. Лідэр сам не становіцца, яго робяць людзі. Калі гэтага захочуць людзі, то іншая справа, а сам я такіх заяваў рабіць ня буду.

**— Што давала Вам сілаў цягам гэтых двух гадоў за кратамі?**

— Я атрымліваў вялізарную колькасьць лістоў, як зь Беларусі, так і з-за мяжы. Мне пісалі ад дзяцей да пэнсіянэраў. Самы старэйшы чалавек, які мне напісаў, быў ва ўзросьце 86 гадоў. Там былі не радкі, а іхныя душы і сэрцы.

**— Можна спрагназаваць, што ўлады не пацісьнуць працягнутую Вамі руку, што рабіць тады?**

— Ня трэба каяцца публічна, важна, каб пакаяньне было ў душы. Гаворка ідзе ня толькі пра Лукашэнку, але і пра ягоную каманду. Калі мы ня можам зьмяніць сьвет, мы павінныя зьмяніць самі сябе. Трэба задумвацца не аб пабытавых праблемах, а аб вечных. Нас усіх чакае Божы суд, які вельмі блізкі. Гэта ня толькі мая прапанова, але і прапанова нябёсаў. Калі гэтая прапанова будзе адрынутая, то Лукашэнка пакажа ўсяму сьвету, што ў яго няма нічога сьвятога. Агульная карысьць дасягаецца толькі шляхам кампрамісу, таму Лукашэнка мусіць пераадолець сябе.

**— Вы не чакаеце, што ўжо гэтымі днямі будзе падпісаны ўказ аб Вашым канчатковым вызваленьні?**

— Я заўсёды разьлічваю на лепшае і рыхтуюся да найгоршага. Сёньня я гатовы да самага горшага разьвіцьця падзей. Я абсалютна ўпэўнены, што да 25 Сакавіка мяне ня вызваляць, што будзе далей, гэта іншае пытаньне.

**— Вы можаце праясьніць сытуацыю, хто канкрэтна Вам прапаноўваў ад'езд?**

— Магу сказаць, што пасол Вайс быў шчыры ў сваім імкненьні мне дапамагчы, але ён не зусім добра ведае беларускія рэаліі. З улады мне прапаноўвалі гэта на самым высокім узроўні, нават ня трэба тлумачыць, на якім, бо і так відавочна.

**— Цяпер Вы вяртаецеся ў калёнію, што будзе далей?**

— Зь сёньняшняга дня я адмаўляюся ад усіх ультыматумаў да ўлады. Я ня буду больш галадаць і супраціўляцца патрабаваньням рэжыму. Чаму? Бо простыя людзі на пахаваньні жонкі мяне прасілі аб гэтым. «Вашае жыцьцё патрэбнае нам», — казалі яны мне. Гэтыя словы абудзілі ўва мне адказнасьць за людзей. Адказнасьць і прымушае мяне прыняць кардынальна іншае рашэньне.

**— Рашэньне аб нявыезьдзе ў Нямеччыну Вы прымалі самастойна ці пасьля парадаў з боку сям'і?**

— Любая жанчына хоча дапамагчы мужу. Любая жанчына хоча ўбачыць хаця б кавалачак сонца і свабоды. Маёй жонцы вельмі хацелася гэтага, але лекаваньне ў Нямеччыне фактычна не прапаноўвалася. Сыходзячы з таго, як хутка памерла мая жонка, то фактычна мне прапаноўвалася, каб яна памерла ў Нямеччыне.

**— З турмы Вы неаднаразова заклікалі ЗША і ЭС увесьці эканамічныя санкцыі супраць Беларусі. Ваша пазыцыя ў гэтым пытаньні не зьмянілася?**

— Кожны мае права прымаць рашэньні, якія лічыць патрэбнымі. Я не зьяўляюся кіраўніком ЗША ці ЭС. Яны прымаюць тыя рашэньні, якія зыходзяць зь іхнага разуменьня маралі і сумленьня. Таму прымаць падобныя рашэньні — іх права. Я ня буду гэтага камэнтаваць.

**— Ва Ўкраіне прагучала, што эўраінтэграцыя здольная аб'яднаць улады і апазыцыю. Ці магчыма нешта падобнае ў нас?**

— Апазыцыя і ўлады розьняцца толькі на асновах духоўных каштоўнасьцяў, а не на нейкіх жорсткіх прыярытэтах матэрыяльнай і суб'ектыўнай рэчаіснасьці. Будучыня Беларусі ў ЭС досыць туманная і аддаленая, але мы павінныя да гэтага імкнуцца, бо гэта будучыня нашай краіны. Ня выключана, што Лукашэнка зноў вернецца на «прынцып дубінкі», і тады Беларусь можа чакаць хаос. І якія наступствы будуць гэтага хаосу, вельмі цяжка сказаць.

**— Ці могуць расейскія выбары неяк паўплываць на сытуацыю ў Беларусі?**

— Роля асобы ў гісторыі ўжо даказаная. Мядзьведзеў — гэта асоба, ён, у любым выпадку, ужо не асоба Пуціна. Так, яны сябруюць і маюць супольную палітыку, але элемэнт асабістага мядзьведзеўскага будзе відавочным. Нам трэба проста пачакаць, у якім ракурсе будуць разьвівацца гэтыя стасункі.

**— Што Вы думаеце пра стан апазыцыі ў Беларусі?**

— Я паставіў кропку на мінулым, і не хачу лезьці ў нейкія разборкі. Цяперашні стан у апазыцыі відавочны. Навошта я буду вам гаварыць тое, што вы і так ведаеце? Калі кожны зробіць крок насустрач адзін аднаму, то мы дасягнем згоды.

**— Вас часта параўноўваюць з Лукашэнкам узору 1994 году. У чым прынцыповае адрозьненьне?**

— Мы з Аляксандрам Рыгоравічам зьяўляемся антыподамі, а яны заўсёды прыцягваюцца. Той, хто займаецца вывучэньнем тэасофскай літаратуры, зразумее, што я сказаў.

**Зьміцер Панкавец**

## Міністар Навумаў: Падставаў амніставаць Казуліна няма

Напярэдадні Дня міліцыі, які адзначаецца 4 сакавіка, міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў адказаў на пытаньні журналістаў. Міністар паведаміў, што ў краіне рыхтуецца чарговая амністыя. У сувязі з гэтым амаль адразу прагучала пытаньне, ці зможа пад гэтую амністыю трапіць экс-кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Казулін.

«Прымяненьне амністыі прадугледжвае, што асуджаны поўнасьцю выконвае свае абавязкі. Асуджаны Казулін на сёньняшні момант мае чатыры папярэджаньні, таму падставаў на падачу амністыі няма. Вы ведаеце, я выконваю закон, а ня ўношу нейкія прапановы. То бок, у нас падставаў для амністыі няма, калі ж будуць прапановы і яны будуць некім падтрымлівацца, то мы іх выканаем».

# Вэнэсуэла—Эквадор—Калюмбія: будзе вайна, якая зацягне й беларусаў?

Вайна не перастала быць працягам дыпляматыі, толькі іншымі сродкамі. Далёка ня ўсе куткі сьвету такія мірныя, як Эўропа. Пра гэта чарговы раз нагадаў выбух напружанасьці на паўночным захадзе Лацінскай Амэрыкі.

Зачэпкай для канфлікту стала дзёрзкая апэрацыя калюмбійскай авіяцыі і спэцвойскаў. У часе яе на тэрыторыі суседняга Эквадору былі забітыя асоба нумар два ў паўстанцкіх Рэвалюцыйных узброеных сілах Калюмбіі (ФАРК) Рауль Рэес і яшчэ 17 (паводле іншых зьвестак — 20) партызанаў. Пакуль няясна, ці загінула разам зь імі жонка Рэеса — дачка галоўнага правадыра калюмбійскіх партызанаў.

Рэес быў адным зь сямі сяброў паўстанцкага сакратарыяту — найвышэйшага каманднага органу. Упершыню за 40 гадоў калюмбійскім уладам удалося зьнішчыць кіраўніка герылы такога высокага рангу.

Афіцыйна сьцьвярджаецца, што перахоп тэлефанаваньняў, а таксама зьвесткі ад шпега дазволілі вызначыць месца начоўкі Рэеса. Пішуць, што з гэтым калюмбійскім вайскоўцам мелі памагчы амэрыканцы. Міністар абароны Калюмбіі падкрэсьліў, што Рэес перабываў усяго за 1800 мэтраў ад мяжы, што калюмбійскія самалёты вялі агонь, не парушаючы паветранае прасторы Эквадору і што толькі пасьля інцыдэнту камандас вывезьлі з эквадорскай тэрыторыі целы Рэеса і другога партызана, не чапаючы астатніх.

Рэес быў галоўным прадстаўніком паўстанцаў на перамовах пра вызваленьне палітычных закладнікаў, якіх утрымлівае ФАРК. Зь ім наўпрост кантактавалі ўрадоўцы Вэнэсуэлы і Эквадору, якім паўстанцы даваяраюць, і Францыі. Парыж патрабуе вызваленьня экс-кандыдаткі ў прэзыдэнты Калюмбіі Інгрыд Бэтанкур, якая мае таксама францускае грамадзянства.

Эквадорскія і вэнэсуэльскія афіцыйныя асобы зьвінавацілі ўлады Калюмбіі ў мэтаскіраваным зрыве перамоваў, абвесьціўшы, што былі блізка таго, каб вызваліць Бэтанкур. Чавэс назваў прэзыдэнта Калюмбіі «паханом банды», а Карэа — кіраўніком «вар'яцкага брахлівага ўраду».

Рэйд на тэрыторыю Эквадору дазволіў уладам Калюмбіі даказаць свае даўнія абвінавачваньні: Эквадор, блізкі саюзьнік Вэнэсуэлы, дазваляе калюмбійскім партызанам выкарыстоўваць свае джунглі ў якасьці базы.

Аднак апэрацыя парушыла міжнароднае права. Войскі адной краіны ня маюць права ўрывацца на тэрыторыю другой. Праўда, тыя самыя нормы на тых жа падставах нядаўна ўзяла пад гусеніцы сваіх танкаў Турцыя ў Ірацкім Курдыстане.

ФАРК вядзе партызанку ўжо 40 гадоў. Напачатку за ФАРК стаяла баявое крыло Камуністычнай партыі, але з часам, калі стала відавочна, што ФАРК скацілася да наркагандлю і бандытызму, камуністы разарвалі стасункі з ФАРК. Партызаны зарабляюць тым, чым і ўсе партызаны: экспрапрыяцыяй. Але калюмбійскія, акрамя таго, увайшлі ў сымбіёз з наркамафіяй і кантралююць вырошчваньне кокі.

Прэзыдэнты Вэнэсуэлы і Эквадору, што прыйшлі да ўлады на хвалі антыамэрыканскага папулізму, здаўна ненавідзяць прэзыдэнта Калюмбіі — вернага саюзьніка ЗША, які абапіраецца на дапамогу Вашынгтону як у барацьбе супраць наркамафіі, так і супраць партызанкі. Тады як Уга Чавэс партызанцы сымпатызуе і ў нядзелю, у сваім штотыднёвым тэлешоў, назваў Рэеса «слаўным хлопцам, сапраўдным рэвалюцыянэрам».

У аўторак улады Калюмбіі апублікавалі новыя дакумэнты, захопленыя, як сьцьвярджаецца, у стане ФАРК. Сярод іх сьведчаньні, што герылья атрымала ў якасьці фінансаваньня ад Уга Чавэса 300 мільёнаў даляраў.

У ноўтбуку Рэеса таксама знаходзіцца ліст, у якім

У аўторак улады Калюмбіі апублікавалі новыя дакумэнты, захопленыя, як сьцьвярджаецца, у стане ФАРК. Сярод іх сьведчаньні, што герылья атрымала ў якасьці фінансаваньня ад Уга Чавэса 300 мільёнаў даляраў.




**Раёны актыўнасьці калюмбійскіх партызанаў. Крыніца: gazeta.ru.**




**Рауль Рэес, зьняты падчас званка Чавэсу.**

Рэес намаўляе сваіх паплечнікаў з ФАРК, каб яны выдалі шэраг закладнікаў, якія ўтрымліваюцца ў джунглях, за пасярэдніцтвам прэзыдэнта Эквадору Карэа, што мела б дапамагчы яму «ў ягоных палітычных дзеяньнях».

У панядзелак прэзыдэнт Эквадору, пад уплывам Каракасу, таксама перасунуў войскі да мяжы з Калюмбіяй. Гэта паставіла рэгіён на мяжу вайны.

Канфлікты ў гэтай зоне здараліся нярэдка. Гэтак, Эквадор у 1981 і 1995 гадах двойчы ваяваў зь іншым суседам — Пэру.

Сытуацыю цяпер разглядае Рада Арганізацыі Амэрыканскіх Дзяржаваў. Пасярэдніцтва ўзяла на сябе прэзыдэнтка Аргентыны Крыстына Фэрнандэс дэ Кіршнэр. Гэта не абяцае нічога добрага: яна выразна стаіць за Чавэса і можа гальванізаваць напружанасьць.

Становішча маглі б разрадзіць недвухсэнсоўныя прабачэньні Калюмбіі перад Эквадорам, але прэзыдэнт Альвара Ўрыбэ на тое наўрад ці пойдзе.

Больш за тое, у аўторак Урыбэ заявіў групе журналістаў пра намер падаць на свайго вэнэсуэльскага калегу ў Міжнародны трыбунал у Гаазе «за апекаваньне і фінансаваньне генацыду».

Папулярнасьць Урыбэ ў краіне рэзка вырасла: большасьць калюмбійцаў ненавідзяць бязьлітасных партызанаў.

А віцэ-прэзыдэнт Калюмбіі паведаміў, выступаючы ў Жэнэве, што ў кампутарах Рэеса ўтрымліваюцца сьведчаньні таго, што ФАРК імкнулася атрымаць радыеактыўны ўран для вырабу «бруднай бомбы».

На лепшае дазваляе спадзявацца хіба тое, што Багота пакуль не перасунула войскаў да межаў з Вэнэсуэлай і Эквадорам. Урэшце, у вайне, у выніку якой цэны на нафту падняліся б за нябёсы, не зацікаўлены ніхто. Акрамя нафтавых колаў, зь якімі, дарэчы, блізкія некаторыя амэрыканскія «ястрабы». І, магчыма, таксама Чавэса, што мае праблемы з папулярнасьцю ва ўласнай краіне: гэтак, ён у сьнежні прайграў уласнаручна арганізаваны рэфэрэндум аб пераходзе краіны да сацыялізму.

Канфлікт у Андах меў бы жудасныя наступствы, бо ў яго маглі б уцягнуцца больш за тры краіны. Чавэс мае амбіцыі арганізаваць панамэрыканскую рэвалюцыю і спансуе праціўнікаў ЗША ад Кубы (таннай нафтай) да Беларусі (канцэсіяй на нафтавыя радовішчы). Яго падтрымліваюць прэзыдэнты Эквадору, Нікарагуа, Аргентыны, Балівіі.

Калюмбійская армія хоць і наймацнейшая ў рэгіёне — за апошняе дзесяцігодзьдзе яна атрымала ўзбраеньняў ад ЗША на суму каля 5 млрд даляраў — але ня мае вызначальнае перавагі над аб'яднанымі сіламі Вэнэсуэлы і Эквадору (**гл.табліцу**).

Вайна ў Вэнэсуэле зачапіла б і Беларусь: у Вэнэсуэле ўжо цяпер працуюць дзясяткі беларускіх грамадзянаў, Беларусь экспартуе туды зброю, а рост цэнаў на нафту стымулюе беларускую эканоміку.

**Мікола Бугай**

### Вайна ў жывым этэры

Прэзыдэнт Эквадору Рафаэль Карэа ў выступе па нацыянальным тэлебачаньні заявіў: «Гэта скандал! Мы выказваем рашучы пратэст! Бо гаворка вядзецца пра самы сапраўдны акт агрэсіі супраць нашай краіны. Мы пойдзем да канца, мы высьветлім, што азначае гэтая скандальная агрэсія на тэрыторыі нашай радзімы, супраць нашай тэрыторыі».

Прэзыдэнт Вэнэсуэлы пайшоў яшчэ далей. У нядзельнай тэлепраграме «Алё, прэзыдэнт» Уга Чавэс расцаніў крокі Ўзброеных сілаў Калюмбіі па зьнішчэньні баевікоў ФАРК на эквадорскай тэрыторыі як найгрубейшае парушэньне тэрытарыяльнай цэласнасьці сувэрэннае краіны. У жывым этэры Чавэс даў указаньне міністру замежных справаў замкнуць пасольства Вэнэсуэлы ў Калюмбіі. Загад атрымаў і міністар абароны: «Спадару міністар, адразу накіруйце да калюмбійскай мяжы 10 батальёнаў, танкі і авіяцыйныя падразьдзяленьні. — Ёсьць! — Абвяшчаю ў краіне найвышэйшую ступень баявой гатоўнасьці! Мы падтрымліваем Эквадор!».

## Вайсковая магутнасьць краін—удзельніц канфлікту

| Краіна | Вэнэсуэла | Калюмбія | Эквадор |
|---|---|---|---|
| Вайсковы бюджэт (2007) | $2.56 млрд | $5.10 млрд | $918 млн |
| Узброеныя сілы | 115,000 | 254, 259 | 57,100 |
| Рэзэрвісты | 8,000 | 61,900 | 118,000 |
| Танкі | 81 | … | … |
| Лёгкія танкі | 109 | … | 24 |
| Бронетранспарцёры | 71 | 228 | 123 |
| Баявыя верталёты | 13 | 31 | 18 |
| Баявыя самалёты | 104 | 115 | 57 |
| Падлодкі | 2 | 4 | 2 |
| Баявыя караблі | 6 | 4 | 8 |

# Украіна мае чым адказаць «Газпрому», але можа не адказаць

Адразу пасьля выбараў у Расеі абвастрыліся ўкраінска-расейскія дачыненьні. 3 сакавіка расейская кампанія скараціла пастаўкі газу ва Ўкраіну на чвэрць, а 4 сакавіка — на палову.

Помста Расеі за намаганьні ўраду Юліі Цімашэнкі зрабіць празрыстымі схемы паставак паліва палягчаецца ўнутранымі палітычнымі канфліктамі ў Кіеве. Прэзыдэнт Юшчанка ня супраць выкарыстаць газавы крызіс для роспуску Вярхоўнай Рады і аслабленьня патэнцыйных канкурэнтаў на прэзыдэнцкіх выбарах 2009 году.

Тым часам Цімашэнка прыдумала спосаб абароны. Яна пагражае ў адказ на газавы шантаж паблытаць карты Расеі ў справе пабудовы новага газаправоду праз Чорнае мора ў Аўстрыю ды Італію.

Падрыхтоўчы этап праекту газаправоду South Stream («Паўднёвая плынь») з Расеі ў Эўропу праз Чорнае мора, у абыход Украіны, завершаны. Але марскі ўчастак газаправоду пройдзе праз эканамічную зону Ўкраіны, і гэта дае Кіеву новыя карты ў рукі.

«Забараніць пабудову газаправоду Украіна ня можа, але яна павінна ўзгадніць маршрут трубаправоду і яго экалягічную экспэртызу», — паведаміў намесьнік кіраўніка Мінпрамэнэрга Расеі Анатоль Яноўскі. Паводле заканадаўства Ўкраіны на экспэртызу і ўзгадненьне адводзіцца адзін год.

Украіна таксама прапануе альтэрнатыўны варыянт паставак газу ў Эўропу, які, на думку віцэ-прэм'ера ўкраінскага ўраду Грыгорыя Нямыры, можа паспрыяць дывэрсыфікацыі паставак газу ў краіны ЭС. Напрыканцы студзеня ў часе візыту ў Брусэль кіраўніца ўраду Ўкраіны Юлія Цімашэнка прапанавала Эўрасаюзу партнэрства ў праекце «Белая плынь» (White Stream). Ідэя стварэньня White Stream заключаецца ў пабудове газаправоду з Туркмэністану праз Азэрбайджан у грузінскі порт Супса і затым па дне Чорнага мора праз Крым у кірунку Эўрасаюзу.

South Stream пройдзе з Расеі ў Баўгарыю па дне Чорнага мора, дзе падзеліцца на дзьве галіны — праз Сэрбію і Вугоршчыну ў Аўстрыю і праз Грэцыю на поўдзень Італіі. Магутнасьць газаправоду складзе 30 млрд куб. м газу ў год. Згодна з плянам ён будзе пабудаваны ў 2012 годзе. Партнэрам расейскага «Газпрому» выступае італьянская кампанія Eni.

**Сямён Печанко**

### ТОП-10 малых гарадоў з самым высокім і нізкім заробкам

| | |
|---|---|
| мястэчка Стрэшын (Гомельская вобл.) | 318 |
| пасёлак Ільіч (Гомельская вобл.) | 334,5 |
| мястэчка Радунь (Гарадзенская вобл.) | 383 |
| пасёлак Барань (Віцебская вобл.) | 401 |
| вёска Бігасава (Віцебская вобл.) | 404 |
| мястэчка Лынтупы (Віцебская вобл.) | 406 |
| мястэчка Яновічы (Віцебская вобл.) | 410 |
| мястэчка Любча (Гарадзенская вобл.) | 410 |
| мястэчка Астрына (Гарадзенская вобл.) | 416 |
| мястэчка Відзы (Віцебская вобл.) | 437 |

### ТОП-10 малых гарадоў і населеных пунктаў з самым высокім афіцыйным узроўнем сярэднемесячнага заробку

| | |
|---|---|
| пасёлак Касьцюкоўка (Гомельская вобл.) | 1100 |
| мястэчка Ўрэчча (Менская вобл.) | 1100 |
| пасёлак Краснасельскі (Гарадзенская вобл.) | 1020 |
| горад Мікашэвічы (Берасьцейская вобл.) | 935 |
| горад Белаазёрск (Берасьцейская вобл.) | 895 |
| горад Валожын (Менская вобл.) | 890 |
| горад Любань (Менская вобл.) | 880 |
| горад Заслаўе (Менская вобл.) | 860 |
| горад Асіповічы (Магілёўская вобл.) | 841 |
| горад Бяроза (Берасьцейская вобл.) | 830 |

Пэрыяд: сьнежань 2007 году, у тыс. рублёў

Як бачым, найлепш жывуць насельнікі мясцовасьцяў, дзе працуюць цэмэнтавыя, малочныя заводы, электрастанцыі і капальні.

**Крыніца: «Заўтра тваёй краіны»**

## СЬЦІСЛА

### «Фольксваген» хоча выпускаць дэталі ў Беларусі

Пра намер супрацоўніцтва зь беларускімі вытворцамі паведаміў адказны за пошук новых пастаўнікоў канцэрну ў Цэнтральнай Азіі і Ўсходняй Эўропе Вадзім Гасман. Ён адзначыў, што ў Беларусі могуць быць разьмешчаны замовы на выпуск запчастак. Асноўныя патрабаваньні да айчынных вытворцаў — якасьць, цана, інавацыйнасьць і гнуткасьць.

### Поўны развал

28 лютага А.Лукашэнка раскрытыкаваў будаўнікоў краіны, назваўшы сытуацыю недапушчальнай. «У будаўнічым комплексе праца цалкам разваленая», — заявіў ён у часе нарады ў прэзыдэнтуры.

### Цэны на мяса, малако і хлеб вырастуць на 15—20 %

Мінэканомікі падтрымала прапанову Мінсельгасхарчу падвысіць закупныя цэны. У выніку цэны на гатовую прадукцыю будуць расьці на 2 % штомесяц. З 25 лютага павышаныя закупныя цэны на малако на 10 %, ялавічыну і сьвініну — на 5 %. Адпускныя цэны на пшанічную муку ў залежнасьці ад гатункаў з 28 лютага павялічаныя на 2,5—3 %. Рост тлумачыцца падаражэньнем паліва і зьменамі ў сусьветнай каньюнктуры.

**СП; БЕЛТА**

# Гульні з кранам паўтараюцца

Скарачэньне паставак газу робіцца звыклай сытуацыяй для ўсходнеэўрапейскай палітыкі: «Газпром» скараціў пастаўкі ва Ўкраіну напалову.



Як і ў папярэдніх выпадках, «Газпром» абгрунтаваў свае захады тым, што Ўкраіна распачала несанкцыянаваны адбор газу.

Нібыта толькі за панядзелак з трубы былі выкачаныя лішнія 104 млн куб. м газу, што складае каля 70 % сутачнага аб'ёму паставак. Скарачэньне паставак паліва на 50% зробіць відавочным магчымы несанкцыянаваны адбор газу ўкраінскім бокам, мяркуюць у «Газпроме». Афіцыйны прадстаўнік холдынгу Сяргей Купрыянаў паведаміў, што нагодай для жорсткіх захадаў кампаніі стала тое, што Ўкраіна не разьлічылася за расейскі газ і не падпісала новых кантрактаў. Ён заклікаў вырашаць гэтыя пытаньні «за сталом перамоваў».

Расейскія аналітыкі Аляксей Макаркін і Дзьмітры Абзалаў мяркуюць, што «Газпром» кіруецца найперш жаданьнем чарговы раз давесьці няздольнасьць Украіны выконваць свае абавязкі па бесперабойным транзыце расейскага газу ў Заходнюю Эўропу. Бескампраміснасьць холдынгу павінна прадэманстраваць бессэнсоўнасьць гандлю ў пытаньнях вызначэньня цэнаў на газ іншым удзельнікам рынку, і Беларусі ў тым ліку.

Са свайго боку НАК «Нафтагаз-Украіна» выступіў з заявай, што абмежаваньне паставак газу ва Ўкраіну супярэчыць галоўнаму прынцыпу тэхнічных умоваў узаемінаў паміж кампаніямі ў газавай сфэры. А менавіта, забесьпячэньню «Нафтагазам» бесьперабойнага і безаварыйнага транзыту расейскага газу эўрапейскім спажыўцам, пры ўмове забесьпячэньня газавага балянсу Ўкраіны. Украінская кампанія заявіла, што своечасова даслала ў Маскву неабходныя дакумэнты для ўрэгуляваньня дачыненьняў у газавай сфэры, аднак не атрымала ніякіх прапановаў у адказ.

НАК «Нафтагаз-Украіна» запэўніў, што гарантуе бесьперабойны транзыт для эўрапейскіх спажыўцоў датуль, пакуль гэта ня будзе пагражаць энэргетычнай бясьпецы Ўкраіны. Паводле інфармацыі кампаніі, ёй афіцыйна не паведамілі пра чарговае скарачэньне паставак газу, а першае скарачэньне ад 3 сакавіка склала 32,2 %, а не 25 %, як заявіў «Газпром». Прадстаўнікі ўкраінскай кампаніі выказалі гатоўнасьць вылецець у Расею на перамовы, паведаміла РБК-Украіна.

Нагадаем, што ўпершыню ў гэтым годзе «Газпром» прыгразіў скарачэньнем паставак газу ва Ўкраіну 10 лютага. Тады, паводле расейскага боку, цягам першых двух месяцаў гэтага году Ўкраіна нібыта прысабечыла 1 млрд 700 млн кубамэтраў расейскага газу і спажывала «без аніякіх дакумэнтаў».

Той канфлікт скончыўся перамовамі прэзыдэнтаў дзьвюх краінаў у Маскве, у выніку якіх Украіна дабілася адмовы ад пасярэднікаў у пастаўках газу і абавязалася сплаціць наяўную запазычанасьць.

На прыкладзе Ўкраіны вучацца і беларускія ўлады.

Паводле падлікаў агенцтва Інтэрфакс, кожны дзень чарговага газавага канфлікту Расеі з Украінай наносіць беларускаму бюджэту шкоду на 140 тысяч даляраў.

Аглядальніца газэты «Белорусы и рынок» Тацяна Манёнак выключае ўдзел Беларусі ў расейска-ўкраінскай спрэчцы, нягледзячы на нядаўні візыт украінскага віцэ-прэм'ера Турчынава ў Менск. Яна нагадвае, што ўжо цяпер 25 % акцыяў «Белтрансгазу» належыць расейскаму «Газпрому», а праз тры гады ў расейцаў будзе палова акцыяў. «У гэтым канфлікце Беларусь будзе на баку Расеі або проста адмаўчыцца», — прагназуе Т.Манёнак. Аднак журналістка мяркуе, што салідарная з Украінай пазыцыя ў пэўных палітычных умовах была б карысная.

Т.Манёнак мяркуе, што цяперашні канфлікт паміж «Газпромам» і ўкраінскім урадам будзе вырашаны праз некалькі дзён: бакі знойдуць кампраміс. «Інакш прыйдзецца зноў абмяжоўваць пастаўкі ў Эўропу, а паўтарэньня гэтага скандалу ніхто не захоча», — кажа яна.

У аўторак стала вядомая рэакцыя Эўрасаюзу: ён патрабуе бесьперабойнасьці паставак. «Эўракамісія заклікала абодва бакі знайсьці найхутчэйшае і канчатковае рашэньне камэрцыйнай праблемы. Мы працягваем уважліва сачыць за разьвіцьцём сытуацыі», заявілі ў Брусэлі.

Сапраўды, ужо ў сераду «Газпром» аднавіў пастаўкі.

**Сямён Печанко**

# У Літве пачаўся бестэрміновы страйк настаўнікаў

Яны патрабуюць павышэньня на 50 % заробкаў і паляпшэньня ўмоваў працы. Урокі не ідуць у 150 школах краіны, пераважна на Жмудзі. У студзені ўлады павялічылі заробкі настаўнікам на 15 %, у верасьні яны абяцаюць чарговыя 20 % дабаўкі. Настаўнікаў такі сцэнар не задавальняе, яны жадаюць аднаразовага павелічэньня заробку.

Цяпер літоўскі настаўнік зарабляе 500 даляраў, але сярэдні заробак па краіне складае 600 даляраў. Улады абяцаюць настаўнікам, што іхныя заробкі зраўнаюцца зь сярэднімі пад 2011 год. Праз малыя заробкі ўсё больш настаўнікаў зракаецца працы ў школах. На думку прафсаюзу працаўнікоў асьветы, пры захаваньні такой тэндэнцыі за 5 гадоў настаўнікаў пачне бракаваць.

**МБ**

# 55

гадоў таму памёр Сталін. Пра Сталіна і Казуліна піша **Віталь Тарас**.

Мой дзед Зьміцер памёр 25 гадоў таму. Ад яго я ўпершыню пачуў характарыстыку Ёсіфа Джугашвілі, якую нельга было сустрэць ні ў падручніках, ні ў прэсе, ні нават пачуць у размовах — «асёл вусаты».

У 1970-я ізноў стала можна ўслых вымаўляць імя правадыра. Тагачасны генсек Брэжнеў у сваім дакладзе, прысьвечаным 30-годзьдзю Перамогі, адзначыў ролю Сталіна як «выдатнага палкаводца» і «дзеяча міжнароднага камуністычнага руху». (Пры ім перастралялі ці не палову кіраўніцтва ўсіх кампартыяў, у тым ліку КПЗБ.) Мне давялося прысутнічаць на прэм’еры кінаэпапэі «Вызваленьне» ў Менску, у нядаўна пабудаваным тады кінатэатры «Кастрычнік». Калі на экране зьявіўся генэралісімус з вусамі й люлькай, публіка ўстала й пачала пляскаць у далоні, нехта крыкнуў «Няхай жыве Сталін!»

А я ў гэты момант успамінаў «вусатага асла». Неяк пазьней маці мне распавяла, што дзед ня стрымліваўся ў выразах на адрас «правадыра ўсіх народаў» ня толькі ў 1970-я, але і ў 1930-я. Сталін заслужыў ад яго званьне жывёлы з вусамі яшчэ падчас працэсу Бухарына-Рыкава, стэнаграмы якога друкаваліся ў савецкіх газэтах.

Дзед Зьміцер, паводле аповеду бацькоў, дый паводле майго ўласнага досьведу, сам быў чалавек аўтарытарны, нават жорсткі, не прызнаваў нічыйго аўтарытэту — спрачацца зь ім было бяз сэнсу. Другі бок характару — ён ніколі нікога не баяўся, нават падчас вайны, калі быў партызанскім сувязным. Баяўся, хіба, толькі лекараў (але ад іх не ўратваўся, патрапіўшы прыканцы жыцьця пад машыну). Сваякі і проста знаёмыя баяліся яго, ягонага маральнага прысуду.

Акрамя Сталіна, асаблівы гнеў і раздражненьне выклікалі ў яго навіны на Беларускім тэлебачаньні. Пабачыўшы на экране (менскі тэлевізар «Рэкорд» у ягонай кватэры ўвесь дзень працаваў на поўную гучнасьць) вядомую тады ўсім дыктарку, дзед пачынаў раўсьці: «Каровы, быкі!!! А вой-вой-вой!» Гэтак ён характарызаваў зьмест навінаў на тэму сельскай гаспадаркі.

Часам думаю: у які стан прывяла б майго дзеда сучасная «Панарама» на БТ?



Няўдалы досьвед пабудовы незалежнай БНР мае палітычнае значэньне для сучаснасьці, ці ня большае нават, чым жнівень–верасень 1991-га. Бо ажыцьцяўлялася тая справа ва ўмовах куды больш неспрыяльных і цяжкіх для Беларусі, чым цяпер.

Другі мой дзед — Яфім, пра палітыку, тым больш, пра Сталіна ўслых ніколі не разважаў. Прынамсі, у прысутнасьці ўнукаў. А вось лягерных парадкаў у 1970-я гады паспытаў. (Дапамаглі ягоныя «сябры» па мастацкім цэху.) Праўда, артыкул быў не палітычны — крымінальны. І сядзеў ён адносна нядоўга, выйшаў паводле амністыі. Але выйшаў іншым чалавекам, цяжка хворым. Ён памёр у 1981-м.

## 20 хвілінаў правасудзьдзя

Да чаго я ўсё гэта вяду? Да таго, што сыстэма — маю на ўвазе, пэнітэнцыярная, прабачце за слова, дый судова-адміністрацыйная — за гэты час не зьмяніліся. Інтэлігентнага чалавека, які гаворыць па-беларуску, валодае некалькімі замежнымі мовамі, але ніколі ў жыцьці не ўжывае расейскага мату, можна кінуць за краты на 15 (а цяпер ужо і на 25) сутак за «брудную лаянку». У прыёмніку-разьмеркавальніку могуць адмовіць у перадачы вязьню харчоў і неабходных рэчаў — а чаму гэта арыштант павінен харчавацца ў турме ня горш, чым на волі? У КПЗ могуць сядзець па 18 чалавек разам, а асьвятленьне ў камэры такое, што чалавек траціць зрок. Начальства калёніі можа палічыць «немэтазгодным» выпусьціць зьняволенага на некалькі дзён на пахаваньне жонкі ці сваяка. (Пра Казуліна — крыху ніжэй.)

І, галоўнае, у Беларусі па-ранейшаму захоўваецца ў Крымінальным кодэксе й дзейнічае ў практыцы «найвышэйшая мера пакараньня»: расстрэл. Дагэтуль няма афіцыйнай статыстыкі на гэтую тэму, па сутнасьці, няма публічных працэсаў па расстрэльных артыкулах, няма ніякай інфармацыі. Хіба што зрэдку, як у выпадку з гарадзенскім міліцыянтам-маньякам ці з гомельскай злачыннай групоўкай, робяць свайго роду паказальныя працэсы. Каб пераканаць публіку, што сьмяротнае пакараньне ні ў якім разе нельга адмяняць.

Скажуць — не расстрэльваюць жа сёньня людзей пачкамі, як у 1937-м. Няма «троек» і «асобых нарадаў», якія маглі вырашыць лёс чалавека за пару гадзінаў. Дзякаваць Богу. Але ўспомніце, колькі часу займае разгляд у судзе справаў маладафронтаўцаў. Адзін з працэсаў заняў 20 хвілінаў. І гэта, магчыма, яшчэ не мяжа. А ці часта прысутнасьць адваката станоўча ўплывала на лёс падсуднага? Без адваката часьцей выносяць мякчэйшы прысуд, чым калі падсуднага абараняе адвакат. Маўляў, ты яшчэ сваімі адвакатамі і сьведкамі працэс зацягваеш…

Захаваліся галоўныя прынцыпы савецкага (чытай сталінскага) правасудзьдзя. Па-першае — прэзумпцыя вінаватасьці. Проста так, ні за што, людзі ў суд не трапляюць. Асабліва, калі супраць іх сьведчаць міліцыянты. І другое. Пакараньне (няважна — на 5 сутак ці на 5 з паловаю гадоў) скіраванае, найперш, на прыніжэньне чалавечай асобы.

## Гаспадары ня мы

Гадоў пятнаццаць таму здавалася, што Сталін і сталінізм — гэта ўсяго толькі мінулае. Пачварнае, жудаснае, але мінулае. І я разам з многімі падзяляў гэтае наіўнае ўяўленьне. Са сьмехам пісаў пра тое, што для сучасных школьнікаў Ленін і Сталін — гэта асобы накшталт фараонаў часоў старажытнага Эгіпту. Магчыма, так яно і ёсьць. Толькі радавацца няведаньню моладзі не выпадае. Бо сёньня беларускіх школьнікаў ня проста возяць на «Лінію Сталіна» — гэта частка таго самага «ваенна-патрыятычнага выхаваньня», на якім трымалася ўся савецкая сыстэма. На мане пра Сталіна, геніяльнага стратэга, які выйграў вайну зь нямецкім фашызмам і наогул усімі ворагамі, трымаецца і сучасная дзяржаўная ідэалёгія. Ідэалёгія ў наяўнасьці. Але якой дзяржавы?

Яшчэ адно наіўнае цьверджаньне самага апошняга часу — быццам Беларусь паслужыла штучным палігонам для расейскіх імпэрцаў, дзе былі адпрацаваныя мэтады вяртаньня Расеі ў таталітарызм. Маўляў, экс-афіцэр КГБ Пуцін стаў пасьлядоўнікам Лукашэнкі, пераймаючы ў яго аўтарытарныя мэтады ва ўсіх сфэрах жыцьця, але пазьбягаючы пры гэтым некаторых ягоных памылак. Але хто ў каго навучаўся?

Тэорыя змоваў, насамрэч, нічога не тлумачыць. Ніводнай спэцслужбе, нават такой магутнай як КГБ, не пад сілу было ўтрымаць СССР ад немінучага распаду. Таксама ніводнай спэжцслужбе ніколі ня ўдасца прымусіць цэлы народ паверыць у ідэалы, у якія ён ня верыць. Ці абраць прэзыдэнтам чалавека, якога ён не прызнае сваім кіраўніком. «Гаспадаром» — як казалі пра Сталіна.

Ізноў мае роздумы прыводзяць да таго, што ў 1991 годзе народ Беларусі не заваяваў сваёй незалежнасьці — яна стала вынікам зьбегу гістарычных акалічнасьцяў. Найперш, эканамічнага заняпаду СССР. Ну і вядома, наяўнасьцю актыўнай апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце БССР у патрэбны момант.

Але ж сёньня выяўляецца, што нават няўдалы досьвед пабудовы незалежнай БНР мае палітычнае значэньне для сучаснасьці, ці ня большае нават, чым жнівень—верасень 1991-га. Бо ажыцьцяўлялася тая справа ва ўмовах куды больш неспрыяльных і цяжкіх для Беларусі, чым цяпер.

Праўда, БССР — і вось тут ужо можна гаварыць пра ролю імпэрскай палітыкі Масквы — была найбольш саветызаванай і ідэалягізаванай рэспублікай Савецкага Саюзу. Яна была больш савецкай, чым нават рэспублікі Сярэдняй Азіі, чым Грузія і Армэнія, ня кажучы пра краіны Балтыі. І нават, у некаторым сэнсе, — чым РСФСР. У Расейскай Фэдэрацыі расейскі нацыяналізм спакваля ўхваляўся партыйнай элітай. Беларускі нацыяналізм у БССР перасьледаваўся, як нідзе. Магчыма, толькі Украінскую ССР можна было паставіць побач. Тым больш нечаканай і загадкавай для мяне (дый ня толькі для мяне, думаю) стала «аранжавая рэвалюцыя» ва Украіне.

## Няма прарока...

У славутай формулы, што кожны народ заслугоўвае той урад, які ён мае, ёсьць важнае абмежаваньне. Размова вядзецца пра абраны ўрад, ці кіраўніцтва. Там, дзе няма свабодных выбараў і свабодных СМІ, гаварыць пра свабоднае волевыяўленьне народу не даводзіцца. Але ж і ў самыя цяжкія часы, пры тыраніі, знаходзіліся людзі, якія не хацелі мірыцца з рабскім становішчам… І гэта таксама аксіёма, якая не дае права тым, хто маўчаў, казаць потым — а што я мог зрабіць? Нешта ж мог…

Калі Аляксандар Казулін на некалькі дзён апынуўся на волі, многія знаёмыя журналісты, дый ня толькі журналісты, загаварылі пра тое, што ён зламаўся як палітык. Маўляў, як жа так — Казулін дарue Лукашэнку? Працягвае яму руку пасьля ўсяго таго, што было. Пасьля зьдзеку зь ягонай сям'і. Дый хіба гэта не безадказныя мары? А што калі Лукашэнка не працягне яму руку насустрач? Ці можа палітык увогуле прамаўляць тымі словамі, якімі стаў гаварыць Казулін, — словамі пра Бога, пра душу, пра дабро і зло, сьвятло й цемру, якія ёсьць у кожным чалавеку?

Шчыра кажучы, я для сябе пакуль не знаходжу адказу на гэтае пытаньне. Напэўна, клясычны палітык эўрапейскага кшталту гэтак прамаўляць ня мог бы. Гэта было б палічана за дрэнны тон, за выкарыстаньне забароненых прыёмаў, дэмагогію і г.д. Але, па-першае, ні ў кога, думаю, сёньня няма падставаў ня верыць Казуліну і абвінавачваць яго ў асабістай няшчырасьці. А па-другое — хто сказаў, што мы маем сёньня дачыненьне з клясычнай палітыкай у Беларусі, пры дрэннай сталінісцкай спадчыннасьці?

Можа быць, некаторым рэчам — такім, як свабода, справядлівасьць, чалавечая салідарнасьць, высакародзтва — насьпеў час вярнуць іх сэнс? Вядома, па вялікім рахунку, гэта пад сілу толькі прарокам. Мы жывем усё-ткі на пачатку трэцяга тысячагодзьдзя ад Нараджэньня Хрыстовага. Эпоха рэлігійных войнаў, крыжовых паходаў і ахвярнага ўзыходжаньня на вогнішча даўно мінула.

Але не абавязкова ўсім клясьціся на крыві ці абяцаць загінуць са зброяй у руках у барацьбе з ворагамі беларушчыны. Часам можна хаця б назваць асла аслом, як гэта не саромеўся рабіць мой дзед. Прычым рабіў ён гэта яшчэ пры жыцьці тырана, а ня толькі па ягонай сьмерці.

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

### Ці зьмяніліся Ваша стаўленьне да Казуліна?

| | |
|---|---|
| маё стаўленьне палепшала | 273 (58.7%) |
| маё стаўленьне пагоршала | 34 (7.3%) |
| не зьмянілася | 158 (34.0%) |

Усяго прагаласавала: 465

# «Прессбол» залічылі да «нячэснай» прэсы

Выканкам Нацыянальнага алімпійскага камітэту (НАК) на паседжаньні ў чацьвер пазбавіў недзяржаўную спартовую газэту «Прессбол» дзьвюх акрэдытацый на летнюю Алімпіяду-2008 у Пэкіне.

Паводле словаў кіраўніка камісіі НАК па рабоце са СМІ Аляксея Мірашнічэнкі, прычынай стаў артыкул мэдалісткі Алімпійскіх гульняў у біятлёне Сьвятланы Парамыгінай «Алімпійская сьметніца», які быў надрукаваны ў газэце ў сьнежні. Нібыта пасьля гэтай публікацыі многія былыя спартоўцы зьвярнуліся з просьбай абараніць гонар і годнасьць НАК.

У артыкуле С.Парамыгіна пісала пра гучную крымінальную справу супраць двух супрацоўнікаў навукова-дасьледчага інстытуту фізкультуры і спорту Міхаіла Сламянца і Леаніда Дварэцкага. Іх абодвух асудзілі на пяць гадоў зьняволеньня ў калёніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасьці. Гэтыя два дзялкі нанесьлі дзяржаве шкоду ў памеры 1 мільярд 151 мільён рублёў. Гэтак супрацоўнікі інстытуту «нагрэліся» на закупцы спартовага і мэдычнага абсталяваньня для патрэбаў міністэрскіх установаў.

«Мы ня можам закрыць газэту, але выказаць сваё стаўленьне маем права», — сказаў першы віцэ-прэзыдэнт НАКу Генадзь Аляксеенка.

Сябры выканкаму аднагалосна падтрымалі прапанову пазбавіць найбуйнейшае спартовае выданьне краіны дзьвюх ліцэнзій на Алімпіяду ў Пэкін. Такім чынам, галоўную падзею спартовага году з сталіцы Кітаю будуць асьвятляць толькі дзяржаўныя СМІ. Па два журналісты паедуць ад «Спортивной панорамы», «Советской Белоруссии», «Рэспублікі» і БЕЛТА, па адным з «Народнай газеты» і «Звязды».

Мы папрасілі пракамэнтаваць сытуацыю галоўнага рэдактара «Прессбола» Ўладзімера Беражкова: «Не магу паверыць у тое, што адбылося. Для гэтага не было ніякіх падставаў і прычынаў. Я ў поўным шоку. Ня так даўно ад афіцыйных асоб нам прыйшла поўная інфармацыя аб Гульнях, у якіх гатэлях будуць жыць журналісты, як перасоўвацца і г.д. Ад нас таксама патрабавалі пэрсаніфікацыі, каб мы як можна хутчэй вызначыліся, хто ж з рэдакцыі едзе ў Кітай. НАК апошнім часам, наадварот, выходзіў на нас з просьбай асьвятляць тыя ці іншыя спаборніцтвы. Мы заўсёды ішлі ім насустрач. Ніякіх прэтэнзій у нашай працы не было. Таму навіну аб пазбаўленьні акрэдытацыі я магу ацэньваць толькі як кулюарныя разборкі, нібыта нас ударылі нажом у сьпіну. Калі высокі чыноўнік кажа, што ня ўстане закрыць выданьне, то ён гэтага хоча. Хоча таму, што мы крытычна ставімся ў газэце да многіх аспэктаў спартовага жыцьця, крытыкуем таго ж чыноўніка».

Падобная сытуацыя з газэтай «Прессбол» ужо ўзьнікала напярэдадні Алімпіяды-2000 у Сыднэі. Тады ў справу давялося ўмяшацца асабіста кіраўніку Нацыянальнага алімпійскага камітэту А.Лукашэнку. Толькі пасьля ягоных заяваў журналіст найбуйнейшай спартовай газэты краіны паляцеў у Аўстралію.

Уладзімер Беражкоў і на гэты раз вырашыў шукаць заступніцтва ў Лукашэнкі, зьвярнуўшыся да яго з адкрытым лістом. Рэдактар «Прессболу» адзначае: «Няўжо гісторыя нічому ня вучыць (чыноўнікаў НАК — **ЗП**)? Мы абсалютна ўпэўненыя ў дзьвюх рэчах. Першае: тое, што рашэньне пазбавіць самае масавае спартовае выданьне краіны акрэдытацыі на Гульнях сыходзіць ад кіраўніка дзяржавы і НАК, — бессаромная мана. Другое: тое, што «Прессбол», незалежна ад абставінаў, асьвятляў і будзе асьвятляць Алімпіяду, — абсалютная праўда. Упэўненыя, шматтысячная армія чытачоў газэты ня будзе пакутаваць. Выданьне, якое заваявала за 17 гадоў працы у іх аўтарытэт, верай і праўдай служыла, служыць і будзе служыць інтарэсам дзяржавы, беларускага спорту, алімпійскага руху».

Варта адзначыць, што гэта ўжо далёка ня першы зварот У.Беражкова да Лукашэнкі з просьбай аб абароне. Ранейшыя спробы рэдактара мелі мала вынікаў.

**Зьміцер Панкавец**

## КАЛЯНДАР

# Сакавік

**1** — 75 гадоў таму памёр у высылцы Ўладзімер Жылка, паэт (нар. у 1900 г.). Пахаваны ў г.Уржум (Ніжагародзкая вобл., Расея).

**3** — Сусьветны дзень пісьменьніка (заснаваны Міжнародным ПЭН-клюбам у 1986).

**9** — 125 гадоў з дня нараджэньня Францішка Аляхновіча (1883—1944), драматурга, пісьменьніка і тэатральнага дзеяча.

**14** — Сьвята ліку Пі.

**17** — 200 гадоў таму (1808) нарадзіўся Шыман Канарскі (в. Дабкішкі, цяпер Падляскае ваяводзтва, Польшча), удзельнік паўстаньня 1830—31 гг., дзяяч вызвольнага руху.

**17** — Дзень Сьвятога Патрыка ў каталікоў.

**19** — Нараджэньне Прарока Мухамада ў мусульманаў.

**20** — Новы год (1387-ы) у мусульманаў (Но Рус).

**21**— 400 гадоў таму памёр Канстанцін Канстанцінавіч Астроскі, палітычны, вайсковы і культурны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага.

**23** — Вялікдзень у каталікоў, пратэстантаў, беларускіх уніятаў...

**23** — 75 гадоў таму Райхстаг прапусьціў закон, паводле якога Гітлер прызнаваўся дыктатарам

**25** — Дзень Волі.

**27** — Міжнародны дзень тэатру.

# Правы за мільён

Аўташколы самі змогуць вызначаць памер платы за навучаньне. Цэны на навучаньне выключаныя зь пераліку паслуг, якія рэгулюе Саўмін. Адпаведны ўказ №131 падпісаў А.Лукашэнка. Кошт навучаньня складаў 800 тыс. руб. Мяркуецца, што новаўвядзеньне скароціць чэргі ў аўташколах, якія сягаюць 8 месяцаў. Навучаньне можа падаражэць на $100.

**СП**

## IN MEMORIAM

### Вера Спарычанка-Шостак

На жаль, адышоў яшчэ адзін чалавек з той грамады, якую мы з пашанай называлі гімназістамі. 25 гадоў у Вільні працавала ВБГ. Сотні людзей у ёй атрымалі адукацыю. Гэта была ня толькі хімія, матэматыка. Найперш, гэта была — Беларусь. Гэту навуку беларушчыны яны захавалі на ўсё жыцьцё і нам, маладым, перадавалі. Вось толькі пытаньне: ці мы аказаліся такія ж самыя старанныя вучні, якімі былі гімназісты.

**Вера Спарычанка-Шостак** нарадзілася 19.12.1917 на Наваградчыне. Усё жыцьцё працавала настаўніцай ангельскай мовы ў Вільні. У яе засталася дачка. Пахаваная яна на праваслаўных могілках Былiны, побач з мужам. Побач зь дзясяткамі сваіх настаўнікаў і аднакашнікаў па Віленскай беларускай гімназіі.

**Сяргей Вітушка**

**26 лютага**

### Дзень народзінаў у СІЗА

Палітвязень **Андрэй Кім** сустрэў 22-годзьдзе ў СІЗА. Нагадаем, дэмакратычнага актывіста А. Кіма затрымалі 21 студзеня падчас разгону дэманстрацыі прадпрымальнікаў. Сьледзтва скончылася. А.Кіма абвінавачваюць у «гвалце або пагрозе гвалту» ў дачыненьні да супрацоўніка ДАІ. А.Кіму пагражае зьняволеньне да шасьці гадоў.

**27 лютага**

### У Горках пратэсты

У Горках актывісты мясцовай кааліцыі дэмсілаў правялі акцыю пратэсту супраць адлічэньня зь сельгасакадэміі **Ігара Пажарыцкага**. Актывісты раздавалі адмысловы нумар недзяржаўнай газэты «Горацкі выбар» з асноўнай тэмай — «Адлічэньне Ігара Пажарыцкага з акадэміі», а таксама газэту «Студэнцкі гарадок», якую рэдагаваў І.Пажарыцкі. 26 лютага студэнта азнаёмілі з загадам пра адлічэньне. Ён будзе абскарджваць загад у Мінадукацыі, а ў выпадку адмовы — судзіцца з адміністрацыяй акадэміі. Ігар зьвязвае адлічэньне з грамадзкай дзейнасьцю. Афіцыйна яго адлічылі за непасьпяховасьць.

### Кацярыну Салаўёву зьбіраюцца судзіць

Актывістку **Кацярыну Салаўёву** выклікалі на допыт у ГУУС Полацку да сьледчага **Аляксандра Малярскага**. Адлічанай з Полацкага ўнівэрсытэту студэнтцы рыхтуюцца прад'явіць абвінавачаньне паводле арт. 193.1 КК за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» і перадаць справу ў суд.

### Буйныя штрафы прадпрымальнікам

Суд Менскага раёну і г.Заслаўя разгледзеў адміністратыўныя справы, складзеныя на трох членаў сям'і прадпрымальніка з Салігорску **Аляксандра Цацуры**, а таксама **Віктара Крываля**. Судзьдзя **Сяргей Афонскі** прызнаў іх вінаватымі ў правапарушэньні паводле арт. 23.4 КаАП («Непадпарадкаваньне законным патрабаваньням супрацоўніка міліцыі») і вынес спагнаньне ў выглядзе штрафаў: Цацура Аляксандар — 50 базавых адзінак (1575000 руб.), **Цацура Тамара** — 30 б.а. (945 тыс. руб.), **Цацура Ільля** — 30 б.а. В. Крывалю, які цяпер адбывае 15-суткавы арышт, таксама завочна прысуджаны штраф памерам 50 б.в. Нагадаем, што 10 студзеня А.Цацура, які зьяўляўся адным з заяўнікаў мітынгу прадпрымальнікаў, разам зь сям'ёй і В.Крывалём накіроўваўся на ўласнай машыне на акцыю ў сталіцу. Іх спынілі супрацоўнікі ДАІ і абвінавацілі ў парушэньні правілаў дарожнага руху. Калі ж А.Цацура зь сям'ёй і В.Крываль рушылі ў Менск пешкі, іх пад прымусам даставілі ў РУУС Менскага раёну, дзе абвінавацілі ў непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі.

### Брата Казуліна спыняў спэцназ

Спэцназ спыніў аўтамабіль Уладзімера Казуліна, брата Аляксандра Казуліна, які суправаджаў брата ў калёніню. У машыне шукалі зброю і выбуховыя рэчывы, правяралі, ці не знаходзіцца яна ў вышуку. Было заяўлена, што машыны няма ў базе ДАІ, таму яе неабходна даставіць у Воршу. Праз 15 хвілін па рацыі паступіла каманда, міліцыянты селі ў сваю машыну і зьехалі. У.Казулін застаўся на дарозе без дакумэнтаў на аўто. Пазьней яму вярнулі дакумэнты без усялякіх тлумачэньняў.



WWW.SVABODA.ORG

**Вацлаў Гавэл зладзіў у Празе сустрэчу дысыдэнтаў з усяго сьвету. На фота ў Чарнінскім палацы зьлева направа: наш Артур Фінькевіч, Аксана Чэлышава з Расеі, Фарыд Тухбатулін з Туркменістану, Гавэл, Асвальда Вальдэс з Кубы, Мін Зін з Бірмы.**

**29 лютага**

### Мілінкевіча затрымлівалі шэсьць разоў за два дні

**Аляксандар Мілінкевіч** кіраваўся ў Берасьце на сустрэчу з гараджанамі. Першы раз аўтамабіль затрымалі каля Івацэвічаў. Міліцыя сьцьвярджала, нібыта кіроўца праігнараваў патрабаваньне супрацоўнікаў ДАІ спыніцца. Пазьней Мілінкевіча затрымлівала міліцыя ў Бярозе й Жабінцы. А ў Берасьці пасьля сустрэчы, на якую сабралася каля ста чалавек, яго затрымалі зноў, прычым у апэрацыі бралі ўдзел дзясяткі міліцыянтаў. На сустрэчу з жыхарамі ў Кобрыні А.Мілінкевічу давялося ісьці пешшу, бо на пад'езьдзе да гораду ДАІшнікі спынілі аўто і прапанавалі праехаць у аддзяленьне. Пасьля сустрэчы — новае затрыманьне за нібыта несанкцыянаваную акцыю.

### Мазырскім пратэстантам не даюць сустракацца

А 20-й у прыватны дом пастара пратэстанцкай царквы поўнага Эвангельля Ісуса Хрыста ў Мазыры нечакана завіталі міліцыянты і супрацоўнікі ідэалягічнага аддзелу райвыканкаму. Як паведаміў сябар царквы і актывіст апазыцыі **Павал Наздра**, вернікі сабраліся ў доме пастара, каб паразмаўляць і папіць гарбаты. Аднак супрацоўніцы ідэалягічнага аддзелу **Тацяна Ганчарова** і **Тацяна Набок** заявілі, што вернікі «ня маюць права праводзіць палітычную агітацыю», і склалі акт аб тым, што «малельны дом выкарыстоўваецца не па прызначэньні і што ў ім адбываюцца сустрэчы ў парушэньне заканадаўства».

### Канфіскавалі «Свабоду»

У актывіста асіповіцкай філіі незарэгістраванага «Маладога фронту» **Арцёма Дубскага** канфіскавалі каля 2 тысяч асобнікаў незалежнай газэты «Свабода», калі ён вяртаўся на аўто ў Асіповічы. Склалі рапарт аб незаконным распаўсюдзе незарэгістраваных газэтных выданьняў. Цягам дзесяці дзён будзе праверка, пасьля якой стане вядома, ці адбудзецца суд.

**2 сакавіка**

### У Салігорску затрымалі ўдзельнікаў мітынгу

У Салігорску на цэнтральную плошчу гораду вышлі каля 300 чалавек для ўдзелу ў мітынгу ў абарону сацыяльных гарантый. Мітынг жорстка разагналі мясцовыя міліцыянты разам зь менскім спэцназам. Былі затрыманыя: **Уладзімер** і **Іван Шылы**, **Андрусь Тычына**, **Крысьціна Самойлава**, **Аляксей Валабуеў**, **Зьміцер Банько**, **Анатоль Міраўнічэнка**, **Рыгор Астапеня**, **Генадзь Кудзелька**. Апошняму пры затрыманьні стала кепска. Яго даставілі ў Старобінскую бальніцу. На восем чалавек міліцыянты склалі пратаколы за ўдзел у несанкцыянаванай акцыі. У.Шылу і З.Банька да суду зьмясцілі ў ІЧУ.

### Сьцяг над міліцэйскім домам

У Асіповічах на даху 9-павярховага дома, дзе жывуць выключна міліцыянты РУУС, зьявіўся сьцяг памерамі 2x4 мэтры. Ён быў заўважны з усіх бакоў і правісеў 45 хвілінаў.

**3 сакавіка**

### Салігорцаў асудзілі на суткі

Судзьдзя Салігорскага раённага суду **В.Лапіна** прысудзіла **Зьмітра Банька** за ўдзел у сацыяльным мітынгу 2 сакавіка да 3 сутак арышту. **Уладзімер Шыла** асуджаны на 15 сутак. Актывістаў зьвінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі (арт. 23.34 КаАП).

**СП**

# Справа 10 студзеня

Тром удзельнікам маніфэстацыі прадпрымальнікаў, што адбылася 10 студзеня, выстаўленае крымінальнае абвінавачваньне.

Не пасьпелі астыць нары пад Зьдзьвіжковым і Фінькевічам, як распачынаецца новы крымінальны працэс. На гэты раз ён скіраваны супраць удзельнікаў гарачай маніфэстацыі эканамічнага пратэсту, што адбылася 10 студзеня.

У аўторак раніцай моладзевым актывістам АГП Міхаілу Пашкевічу і Міхаілу Крываву і маладафронтаўцу Ўладзімеру Сяргееву прад'явілі афіцыйныя абвінавачваньні ў крымінальнай справе за мітынг прадпрымальнікаў 10 студзеня. Гэтыя маладзёны наведалі Сьледчае ўпраўленьне папярэдніх расьсьледаваньняў ГУУС Менгарвыканкаму (Сапёраў, 7).

**Абвінавачваньне ў «справе 10 студзеня» пагражае М.Пашкевічу, А.Бондару, А.Баразенку, П.Вінаградаву, В.Сяргееву, А.Дубскаму, А.Стральцову, А.Чарнышову, А.Кіму, А.Койпішу, М.Крываву, М.Субачу, Т.Цішкевіч, а таксама непаўналетняму М.Дашуку.**

Сьледчы, палкоўнік Павал Міхалькевіч, паведаміў хлопцам, што са статусу падазроных яны пераводзяцца ў абвінавачаныя. Яны праходзяць паводле арт. 342 ч.1 КК «Арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак, або актыўны ўдзел у іх». Прадугледжваецца пакараньне ад штрафу да трох гадоў пазбаўленьня волі.

Як паведаміў «НН» Уладзімер Сяргееў, у яго спрабавалі ўзяць паказаньні, але хлопец адмовіўся. З усіх трох узятая падпіска пра нявыезд. Таксама са словаў Сяргеева, у дадзенай крымінальнай справы ўжо не 12, а 14 фігурантаў. У сьпіс падазраваных дадалі А.Дубскага і А.Койпіша. Андрэй Кім, які знаходзіцца ў СІЗА за нібыта зьбіцьцё міліцыянтаў, таксама фігуруе ў гэтай крымінальнай справе.

Да 11 сакавіка сканчваецца тэрмін папярэдняга сьледзтва па справе. Пасьля чаго «крыміналку» могуць падоўжыць ці ўжо перадаць у суд.

Пазьней стала вядома, што арыштаваны віцебскі прадпрымальнік Сяргей Парсюкевіч. 4 сакавіка у 11.00 Парсюкевіч зьявіўся ў Маскоўскі РУУС на допыт паводле сваёй крымінальнай справы. Праз дзьве з паловай гадзіны допыту сьледчы Дзьмітры Разанка пастанавіў арыштаваць прадпрымальніка на трое сутак.

Паводле словаў Вячаслава Сіўчыка, які прыходзіў у РУУС разам з Парсюкевічам, «у кабінэт да сьледчага пачалі заходзіць нейкія студэнты — як потым высьветлілася, гэта былі панятыя».

31 студзеня ў дачыненьні да Сяргея Парсюкевіча была заведзеная крымінальная справа паводле артыкулу 364 КК («Гвалт альбо пагроза гвалту ў адносінах да работніка міліцыі») прадпрымальніку пагражае да шасьці гадоў зьняволеньня. Абвінавачваньне зводзіцца да таго, што падчас адбыцьця 15-суткавага арышту на Акрэсьціна, Парсюкевіч зьбіў намесьніка дзяжурнага Аляксандра Длупа.

Падчас арышту прадпрымальнік будзе знаходзіцца ў СІЗА, якое разьмяшчаецца ў новым корпусе ізалятару на Акрэсьціна.

Варта адзначыць, што раніцай Сяргей Парсюкевіч наведаў францускае пасольства, дзе сустрэўся з дарадцам пасла Філіпам Сэньёрэнам. Прадпрымальнік паведаміў падрабязнасьці сваёй крымінальнай справы.

**Зьміцер Панкавец**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**1 сакавіка ў менскай Катэдры прайшоў тэлемост з Бэнэдыктам XVI, прымеркаваны да Эўрапейскага дня студэнтаў. У ім узялі ўдзел каля пяці тысячаў вернікаў зь Беларусі. Папа зьвярнуўся да вернікаў на нашай мове. Ён заклікаў «будаваць цывілізацыю любові» і прымаць у жыцьці «правільныя рашэньні ды дзеяньні, поўныя веры і эвангельскае адвагі».**

# Вялікі дзякуй

**Эдуарду К., Ірыне З., Андрусю А., Васілю Г., Валянціне С., Веры А.** зь Менскага раёну.
**Аляксандру Б., Юр'ю Дз.** з Горадні.
**С.Ф.** з Мазырскага раёну.
**Тадэвушу Ш.** з Маладэчанскага раёну.
**Марату Ш.** з Наваполацку.
**Міхаілу Т., Юр'ю Л.** з Слуцку.
**Уладзіславу М.** з Калінкавіцкага раёну.
**Андрэю Л.** з Салігорску.
**І.Р., Руслану Г., Анжэле Б.** з Баранавіцкага раёну.
**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.
**Васілю К., Мікалаю П.** зь Віцебску.
**Віталю Ц.** з Жлобінскага раёну.
**Анатолю Б., Алегу Дз.** з Магілёва.
**Вользе Ж.** з Барысава.
**М.Ш.** з Клімавіцкага раёну.
**Юр'ю Б.** з Кобрыньскага раёну.
**Міхаілу Г.** зь Берасьця.
**Зьмітру К.** з Мастоўскага раёну.
**Я.Г., Зьмітру К., Зьмітру С., Ігару Я., М.Я., Яўгену С., Т.Ж., Валянціне Ш., Ірыне К., Міхаілу С., Юр'ю Ш., Аляксандру Я., Васілю С., Іраідзе З., Вячаславу К., В.К., Н.К., М.Л., А.А., Уладзімеру Н., Я.Ш., А.С., Міхаілу Ж., Анатолю Я., Тамары Ц., Веры С., І.С., Тэрэсе Р., Марыі М., Т. П., Альберту С., А.Л., Ігару С., Сямёну М., Уладзімеру П., Л., Аляксандру П.** зь Менску.

**Франц Сіўко. Дзень Бубна.** — Менск: Логвінаў, 2008. — 276 с.




Замаўляйце кнігі сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» праз т.: **(029) 505-39-11, (029) 126-36-87** або праз e-mail: **knihi@me.by**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перაказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Рок-каранацыя — дзіўны сон

У часе цырымоніі ўганараваньня айчынных рок-гуртоў на сцэну выйшлі ці ня ўсе забароненыя калісь выканаўцы. Некалькі крышталёвых каронаў музыкі атрымалі з рук апальных пісьменьнікаў і мастакоў.

Тое, што на Каранацыі выступяць гурты з «чорнага сьпісу», стала вядома яшчэ пры канцы студзеня. Аднак, мяркуючы па рэакцыі гледачоў, шмат хто зь іх да апошняга ня мог паверыць у сваё шчасьце — выхад на сцэну N.R.M., чый лідэр Лявон Вольскі, які шматзначна пакашліваў у мікрафон, наладжваючы гітару, быў сустрэты хваляй захапленьня. Энэрэмаўцы выканалі дзьве песьні — «Менск і Мінск» і «Мама,тата — гэта я». Апошнюю традыцыйна — разам зь дзеткамі. Затым вядоўцы цырымоніі — музыкі і ды-джэі «Эўрарадыё» Аляксандар Памідораў ды Марыя Лагодзіч, перайшлі ўласна да абвяшчэньня пераможцаў «Рок-каранацыі—2007». Аляксандар ды Марыя цягам вечару колькі разоў зьмянялі строі — ад строгіх да несур’ёзных. Кароны і дыплёмы на сцэну выносілі прыгажуні ў сукенках адна лепш за другую.

Адкрыцьцём году стаў гурт «Дзецідзяцей». Яго салістка Ганна Хітрык, акторка Купалаўскага тэатру, прэмію атрымала з рук пісьменьніка і мастака Адама Глёбуса, які адпусьціў сьпявачку ад мікрафону толькі пасьля сэрыі пацалункаў. Выступ «Дзяцей» атрымаўся надзвычай эмацыйным і быў прыхільна сустрэты публікай. На прыз у гэтай катэгорыі прэтэндавалі таксама гурты Indra і M.L.A.

У намінацыі «Прарыў году» карону атрымалі «Фляўс і Кляйн» з Наваполацку. Хлопцы адзначылі перамогу над «Тарпачом», які таксама цягам году прарываўся да ўзнагароды, пэрформансам з выцісканьнем памідору, скокамі і поўзаньнем па сцэне.

Кліпам году, а таксама найлепшай песьняй году аўтарытэтнае журы прызнала «Капітал» Ляпіса Трубяцкога. Паколькі Сяргей Міхалок і К зьехалі на гастролі ў Кіеў, прэмію атрымаў рэжысэр кліпу Аляксей Церахаў. Ён сьціпла нагадаў, што дзесяць год таму зрабіў кліп да песьні «Ляпісаў» «Ау», таму яму вельмі прыемна, што «празь дзесяць год яго нарэшце адзначылі». Аляксандар Памідораў шматзначна запытаўся ў залі, ці ўсе бачылі ўзнагароджаны кліп і ці ўсе яго вэрсіі.

Выканаўцу году слухачы вызначылі праз сайт «Тузін Гітоў» — ім стаў Лявон Вольскі, які выйшаў на сцэну ў складзе «Крамбамбулі» разам з салісткай Белдзяржфілярмоніі Нінай Цішко. Прыз Лявон Вольскі атрымаў ад мастака Алеся Марачкіна. Памідораў заўважыў: «Паколькі вашыя здымкі пачалі зьнікаць з кніжак, то хоць паглядзім на вас жыўцом».

Другую частку канцэрту распачаў «Палац». Пасьля выкананьня дзьвюх кампазыцыяў лідэр гурту Алег Хаменка нечакана папрасіў зайграць і трэцюю. Агульная ўхвала залі прымусіла рэціравацца вядоўцаў за кулісы. Затым Алег Хаменка ўручыў карону гурту з Магілёва OSIMIRA, які перамог у намінацыі «Традыцыі і сучаснасьць». Заснавальнік і ўдзельнік этна-гурту Андрэй Паўлаўчэня падзякаваў Хаменку за гонар пераняць слаўныя традыцыі беларускага фольку словамі «Дзякуй, тату».

Рок-князёўнай стала вакалістка гуртоў «Тарпач» і Žygimont Vaza Вольга Самусік. Яна шчыра прызналася, што ня ведала пра існаваньне такой намінацыі. На што Аляксандар Памідораў патлумачыў: «Намінацыю давялося вярнуць на «Каранацыю», бо прэтэндэнтак на яе, на шчасьце, штораз усё больш». Публіка, аднак, неадназначна паставілася да манеры выкананьня Вольгі. Калі тая прапанавала песьню для усіх закаханых «Ахвяры лібіда», з залі пачулася рэпліка з ноткамі адчаю ў голасе: «А можа, ня трэба?!».

«Тарпач» на сцэне зьмяніла «Крама», якая сёлета прэтэндавала на прыз адразу ў дзьвюх намінацыях — альбом году і песьня году. У залі ўсталі людзі, сярод якіх багата было мужчынаў — аднагодкаў Ігара Варашкевіча, якія бадзёра танчылі пад пасталелую на 20 год «Стэфку». Штопраўда, адзін строга апрануты дзядзечка ў першым шэрагу, які праз увесь канцэрт ніводнага разу не ўсьміхнуўся і не паапладаваў музыкам, увогуле заснуў.

Расейскі тэлеканал A-ONE, які акурат у лютым адчыніў у Менску сваё прадстаўніцтва, уручыў уласны прыз гурту «Этна-трыё Тройца». Генэральны дырэктар тэлеканалу ў Беларусі Алег Скарабагаты перадаў «Тройцы» адпаведны сэртыфікат, які гарантуе прасоўваньне і шчыльную ратацыю ягонага кліпу «Тры янгалы» на тэлеканале. Да ўсяго, менавіта на A-ONE можна будзе пабачыць тэлевэрсію цырымоніі «Рок-каранацыя-2007».

Альбом «Калыханкі» гурту WZ-

**Вынікі Рок-каранацыі’2007**

Адкрыцьцё году — гурт «Дзецідзяцей».

Прарыў году — «Фляўс і Кляйн».

Кліп году — «Капітал» (гурт «Ляпіс Трубяцкой» (рэж.А.Церахаў)).

Песьня году — «Капітал» («Ляпіс Трубяцкой»).

Выканаўца году (вызначаўся праз сайт «Тузін Гітоў») — Лявон Вольскі.

Традыцыі і сучаснасць (лепшы фолк-выканаўца году) — «Osimira».

Рок-князёўна (спэцпрыз) — Вольга Самусік («Тарпач», «Zygimont Vaza»).

Спэцпрыз ад тэлеканалу A-ONE — «Тройца».

Праект году — дзіцячы фонд ААН UNISEF — «Калыханкі» («WZ-Orkiestra»).

Альбом году — «Stasi» («Neuro Dubel»).

Рок-Карона (гурт году) — «Neuro Dubel».




**Рок-карону Аляксандру Кульлінковічу ўручае Ўладзімер Арлоў.**

Orkiestra, запісаны пры падтрымцы дзіцячага фонду ААН UNISEF, стаў праектам году. У часе атрыманьня прэміі, каардынатарка праекту Юлія Ляшкевіч заявіла, што прысьвячае гэтую перамогу памяці Ірыны Казулінай. Гледачы віталі яе заяву воплескамі.

А альбом Neuro Dubel «Stasi» стаў галоўным альбомам году. «Дзюбелі» выканалі толькі адну песьню, каб адразу пасьля кароткага сыходу са сцэны вярнуцца па галоўны прыз «Каранацыі» — Рок-карону (гурт году). Пісьменьнік Уладзімер Арлоў, аддаючы Аляксандру Кульлінковічу галоўную карону, распавёў даўнюю гісторыю пра прыезд у Полацак Уладзімера Мулявіна зь «Лявонамі», калі канцэрт ансамблю апынуўся пад пагрозай праз даўжыню валасоў музыкаў: «Я тады быў дзесяцікляснікам, слухаў «Бітлоў» і «Ролінгаў» і скептычна ставіўся да свайго. На шчасьце Мулявін паслухаўся галоўнага ідэоляга і схадзіў у цырульню. Такім чынам ува мне прачнулася зусім новая істота». Уладзімер Арлоў падарыў лідэру Neuro Dubel колькі сваіх кніжак, у якіх былі тэксты як пра «Лявонаў», так і пра Stasi. На разьвітаньне пісьменьнік падзякаваў беларускім гуртам, якія «здольныя зьмяніць да лепшага цэлае пакаленьне, дорачы маладым пачуцьцё Свабоды».

Аляксандар Кульлінковіч, які ўжо другі раз атрымаў гэты прыз, шчыра радаваўся перамозе разам з заляй, якая ад пачатку цырымоніі скандавала «Нэйра Дзюбель».

Вядома, што большасьць гледачоў незнаёмая з асаблівасьцямі ды акалічнасьцямі падрыхтоўкі «Рок-каранацыі». У фае канцэртнай залі можна было пачуць словы пра тое, што нарэшце ў Менску надарылася магчымасьць патрапіць на добры канцэрт ды пабачыць разам на сцэне ўлюбёных музыкаў. Маладыя людзі з захапленьнем абмяркоўвалі афармленьне сцэны, добры гук і камэру, што лётала над галовамі гледачоў. Тым часам, у арганізатараў штогадовай цырымоніі свае пытаньні да імпрэзы. Так, музычны партал «Тузін Гітоў» заявіў пра выхад зь ліку арганізатараў і стварэньне сваёй музычнай прэміі.

Варта адзначыць тых, хто вызначаў сёлета галоўных беларускіх рок-герояў 2007 году. Гэта Сяргей Анішчанка (дырэктар фэстывалю «Рок-кола»), Тацяна Заміроўская (музычны аглядальнік «Белорусской газеты»), Радэк Дамброўскі (арганізатар фэстывалю «Басовішча»), Сяргей Будкін (галоўны рэдактар парталу «Тузін Гітоў»), Давід Блюўштэйн (прадусар фэстывалю «be2gether»), Віктар Сямашка, (музычны журналіст, радыё «Юністар»), Зьміцер Падбярэскі (музычны журналіст), Юры Цыбін (заснавальнік цырымоніі «Рок-каранацыя»), Віталь Супрановіч (кіраўнік лэйблу БМА-груп), Валік Грышко (рэдактар MTV у Беларусі), Максім Жбанкоў (журналіст, культуроляг), Маша Яр (музычны рэдактар «Аўтарадыё»), Павал Кашырын (арганізатар рок-канцэртаў), Віктар Пазьнякоў (мэнэджар беларускага каталёгу кампаніі West Records), Кацярына Пытлева (музычны журналіст, Першы музычны канал) і Віктар Гольцаў (кіраўнік лэйблу Go-records).

**Сямён Печанко**

# Адлегласьць

J:Mors,
2008




## Альбом як лінолеюм.

«Гэта толькі Твая адлегласьць,
І ніхто не павінен ведаць,
Дзе і як Ты трымаеш кантроль,
Дзе радасьць Твая і Твой боль...»

Словы з загалоўнай песьні дакладна характарызуюць новую працу самага ўпартага, спакойнага і пасьлядоўнага беларускага гурту. З кружэлкі насамрэч цяжка даведацца пра радасьць і боль Уладзімера Пугача. Тэксты песень напоўненыя размытымі і сэнтымэнтальнымі вобразамі аэрадромаў, паветра, краявідаў — усяго таго сьвету, куды ў марах адлятае мэнэджар сярэдняга зьвяна ў перапынках між перамовамі па дарозе дадому, а можа, і падчас саміх перамоваў.

Дашукацца і назаўжды разам вырвацца з гораду.
І кранаць валасоў Тваіх беларускае золата...

Гэтай кружэлкай Вы дакладна не папсуяце псыхіку дзіцяці, бацькам ці блізкаму чалавеку. Яна — унівэрсальны падарунак («Ня ведаеш, што купляць — купляй J:Morc, горш ня будзе»). Ад дыску сыходзіць атмасфэра рэспэктабэльнасьці, сталасьці. З буклету на нас пазіраюць 35—40-гадовыя мужчыны, у якіх усе «дэманы» даўно за плячыма. Самую нэрвовую песьню альбому «Зорку Вэнэру» (ніякіх алюзій на «Песьняроў» і Багдановіча, гэта анты-Багдановіч!) можна ставіць дзецям перад паходам у царкву ці касьцёл (ці замест).

Архетыповая мара беларускага рок-музыкі — дагнаць і перагнаць «Песьняроў» — вылілася ў кавэр (калі можна гэтак сказаць пра народную песьню) «А ў полі вярба».

(Псэўда-)хрысьціянскі падтэкст там-сям праяўляецца ў «агульных месцах», кшталту:

«Ты адчуеш позірк на сабе,
Ён напоўніць зьместам Твой сусьвет»
(Ты адчуеш позірк на сабе)

Па-мойму, Хрыстос выказваўся куды больш канкрэтна.

Кружэлка адлюстроўвае і пэўную мэйнстрымізацыю беларускамоўнасьці культуры. Праз факт праслухоўваньня «Адлегласьці» ніхто не назаве Вас нацыяналістам. Вы сучасны малады чалавек, у курсе навінак, вось вырашылі «прыабшчыцца» да роднага слова праз J:Mors (дзякуй Богу, постэры альбому разьвешаныя ва ўсіх музычных крамах Беларусі).

Прыхільнікі беларускага року могуць падзякаваць Пугачу з Арловым-малодшым, што цяпер гэта ўжо ня толькі альтэрнатыўнае мастацтва. І ня толькі для падлеткаў. Пакаленьне, якое спарадзіла «морсаў», расло на кніжках Арлова-старэйшага і Быкава, пасьля ўцягнулася ў вір дарослага жыцьця — «кава, бізнэс, перамовы», офісная руціна, сям’я — і раптам адчула настальгію па маладосьці, якую гэты альбом задаволіць — цалкам бясьпечна.

Гэты альбом як лінолеюм — абсалютна роўны, гладкі і ўнівэрсальны. Я ўпэўнены, што ён будзе добра прадавацца. Але сабе я яго не набуду.

Рэальнае жыццё Ул. Пугача амаль не прабіваецца ў ягоныя песьні (Цікава, ці працуе ён шчэ юрыстам?) Пугач «шыфруецца» за рамантычна-сэнтымэнтальным вобразам і размытымі тэкстамі. Нават у фільме, прыкладзеным да дыску, адны беларускія дарогі і гарады — і ніводнага твару. Нармальная сытуацыя для краіны, дзе грамадзтва звыклася кантраляваць сябе.

# Humanoid?

Глюкі




## Вольскі нэрвова курыць у куце.

Калі Вам здаецца, што жыцьцё абыходзіць Вас бокам, паслухайце гэтую плытку. Патрыятычнай моладзі, увогуле, трымаць на паліччы, як абавязковы антыдэпрэсант. Інакш хана.

Атмасфэра падлеткавай party, дзе шумна, шмат алькаголю і незнаёмцаў, знаёмстваў і расстаньняў...

Адна з галоўных фішак магілёўскага гурту — дзіўны кантраст між не памясцоваму супэрзапальнай музыкай і па-мясцоваму звышдэпрэсіўнымі тэкстамі. Мажліва, падобныя песьні і з тым жа настроем сьпявалі лучнікі Робіна Гуда па дарозе на шыбеніцу. Так граюць людзі, якім насамрэч на**аць, што зь імі будзе заўтра.

...І праз увесь гэты сьцёб і браваду праходзіць такі нэрв, такі боль. Музыка ўзьнікае, нібы кампэнсацыя — калі табе горш за ўсё і ты пачынаеш сьмяяцца і жартаваць аж надзвычай гучна. Такая гіпэртрафаваная весялуха з ухілам у максымалізм, ад якой усё ж робіцца лягчэй…

«Хутка я запоўню глебу геніяльным угнаеньнем», — на такім нэрве Сід Вішэз перасьпяваў «My Way» Фрэнка Сінатры. Такую музыку і так трэба граць (і слухаць), калі табе 19—20 і ўсё жыцьцё наперадзе. Каб не было пасьля сорамна за страчаную маладосьць. Упэўнены, «Глюкам» будзе што расказаць унукам (і даць паслухаць — каб «наглюкаліся»).

Вольскі, «працытаваны» ў пачатку альбому, нэрвова курыць у куце. Але ці пратрымаюцца хлопцы столькі ж, а калі пратрымаюцца, то ў што ператворацца?

# Двухкроп’е

Тацяна
Беланогая



## Сьціплы жаночы эратызм.

Таня Беланогая сабрала свае новыя і лепшыя песьні і запісала іх у добрай студыі з класнымі музыкамі (там жа, дзе пішуцца Алесь Камоцкі і Зьміцер Вайцюшкевіч). Атрымалася па-жаноцку натуральная і пяшчотная музыка, мяккая і спакойная, як Нарач у бязьветраны дзень. Дзе-нідзе праз дзявочыя рамантычныя перажываньні прабіваюцца хрысьціянскія матывы («Мара»). Сацыяльная тэматыка амаль не закранаецца. Альбом «дасьпелы», хаця словы самай эра-

тычнай песьні Тацяна пазычыла ў Натальлі Кучмель.

У тэкстах — канкрэтнасьць, жыцьцёвасьць, самапаглыбленасьць, «ідэнтычнасьць», сьціплы жаночы эратызм а-ля Яўгенія Янішчыц. Агульны падтэкст — «Зямля не для каханьня». Таня памякчэла ў лірыцы, хаця часам зьяўляюцца рэзкія вобразы («сьляпыя кіроўцы зьбіваюць сабак»), і голас робіцца па-прапаведніцку эмацыйным.

Хапаюся за сэрца — у дзьвюх песьнях падыграла віялянчэлістка Юля Глушыцкая, абудзіла настальгію па «Новым Небе».

Самы «дарослы» Танін альбом. Восеньская лірыка для студэнтак гуманітарных спэцыяльнасьцяў і проста дзяўчат/жанчын, якія шмат думаюць.

P.S. Адзінае пытаньне — ці не зарана Таня вырашыла «пасталець»? Бо зрабіць гэтым песьням больш сучасныя арынжыроўкі, трохі «напампаваць» эмацыйна — і быў бы неблагі тынэйджэрскі поп-праект а-ля Maksim. А так — «самота асобна ўзятай дзяўчыны ў вялікім горадзе» ці штосьці ў тым жа кірунку — я не паглыбляўся.

# Тры расейскія літары

ЗігЗаг, 2007




Як чалавек, што вучыўся ў Швэцыі і Нью-Ёрку, ён ведае, з чаго пачынаць.

Асноўны напрамак высілкаў Ігара Загуменава — вывесьці беларускую музыку ва ўсясьветны кантэкст ці наадварот — усясьветны кантэкст увесьці ў беларускую музыку. Як чалавеку, што вучыўся ў Швэцыі ды Нью-Ёрку, яму гэта даецца прасьцей за іншых. Адно гэтае вартае павагі.

Новая плытка — «зваленыя ў кучу» запісы, зробленыя пасьля альбому «Bionic». Матэрыял featurednaбаковы, не такі канцэптуальна-занудны (sorry, атмасфэрна-мэдытатыўны). Асабліва гэта адчуваецца на жывых выступах Ігара. Ад старых часоў zIGZAG-у засталася лёгкасьць, бесклапотнасьць, амаль дзіцячая разьняволенасьць.

Загалоўная песьня — «прыкольны» маркетынгавы крок (успомнілася «Я знаю три слова» Найка Барзова). Ігар, магчыма, прачытаў кніжку па прамоцыі гурту. Ці яму прыеўся псэўдарамантычны вобраз пай-хлопчыка. У тое, што Ігара насамрэч цікавіць вышэйзгаданае слова, асабліва ня верыцца.

Патасная «World Mine Free», запісаная для саміту ў Найробі, дзе Ігар, не раўнуючы як Бона з U2, змагаўся за ачышчэньне афрыканскай зямлі ад мін. Той жа піяр, але больш цывілізаваны. На гітары, улічваючы адказнасьць запісу, падыграў Піт Паўлаў.

...Гм, Ігар, асьцярожна — з такімі песьнямі заканчваюць кар’еру ў рок-музыцы, але не пачынаюць. Усясьветны досьвед паказвае — каб сьпяваць песьні пра «мір ва ўсім міры», трэба спачатку прасьпяваць тое, што будзе падабацца сантэхнікам і водаправодчыкам... One love, one life...

Таксама прысутнічаюць рэмікс на заезджаную «Песьню хвалі» і два кавэры God’s Tower.

«Страшна далёкія яны ад народу» ((с) Ул. Ленін).



Рок-князёўна Вольга Самусік.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Гарбуз зарэзаў сон!

## Крывавыя дзіцячыя гульні

У апошні дзень зімы, ды яшчэ раз на чатыры гады — 29 лютага, — які спэктакль маглі паставіць «купалаўцы», акрамя крывавага шэксьпіраўскага «Макбэта»? Верагодна, такім самым чынам яны будуць адзначаць Гэлоўін і Вальпургіеву ноч. Піша **Аляксандар Фядута**.

У залі было шмат падлеткаў (здаецца, з настаўніцай), што ня дзіўна: «Кашмар на вуліцы Вязаў», скажам, разьлічаны, перш за ўсё, на падлеткавую аўдыторыю. Але адна з самых крывавых п’ес вялікага брытанца пастаўленая вельмі нават па-даросламу. Літоўскі рэжысэр Альгірдас Латэнас пабачыў у ёй процьму вечных праблемаў, што і паспрабаваў данесьці да чытача сваёй наватарскай пастаноўкай.

Шчыра кажучы, я ішоў на «Макбэта», баючыся пабачыць чарговую банальную гісторыю пра тое, як усенародна абраны кіраўнік дзяржавы (Макбэт — Алег Гарбуз) становіцца прымітыўным забойцам, які арганізуе зьнікненьне былога паплечніка (Банка — Мікалай Кірычэнка) — ну, і іншае, іншае, іншае... У рэшце рэшт, быў жа момант, калі і на менскіх сцэнах ішлі амаль адначасова тры п’есы пра шалёную злачыннасьць улады — «Эрык XIV» Стрындбэрга, «Рычард» таго ж Шэксьпіра і «Барыс Гадуноў» Пушкіна — Мусаргскага. Але сп.Латэнас выявіўся намнога больш тонкім і вынаходлівым у сваім тлумачэньні.

Прыдуманы Латэнасам і сыграны Гарбузам Макбэт... не вінаваты! То бок, вядома, вінаваты, бо пралітую кроў цалкам добразычлівага караля Дункана (такі сабе лагодны і самавіты экс-старшыня Дзяржпляну БССР — вельмі дакладная праца Сяргея Кірычэнкі) з рук ніяк ужо ня змыеш. І не таму, што звар’яцелыя наагул ня маюць плаціць па рахунках. А таму, што іх Макбэт — гэта маленькі хлопчык, што прызвычаіўся на практыцы рэалізоўваць свае страшныя фантазіі. Возьмем, напрыклад, выдатную сцэну, у якой ён, ужо каранаваны, аддае загады забойцам — Паўлу Яскевічу і Аляксандру Паўлаву, што выйшлі з глядацкай залі ў модных сучасных строях, падобных да тых, якія я ў 1994 г. яшчэ назіраў на супрацоўніках службы бясьпекі кара... (эх, куды мяне занесла!) — так, вядома, Яго Высокасьці. Макбэт (Гарбуз), быццам хлопчык, спрабуе сьпіхнуць на іх віну за прынятае ім рашэньне выдаліць Банка, арганізаваць ягонае зьнікненьне. І так — на працягу ўсяго спэктаклю.

Тым больш што такая трактоўка цалкам адпавядае трактоўцы ролі лэдзі Макбэт (вось ужо дзе разгарнулася Сьвятлана Зелянкоўская). Але нават спакушаючы будучага караля ўсім арсэналам вабнотаў, якія ў яе толькі ёсьць, жонка ставіцца да яго як да нерашучага хлопчыка, апанаванага сумневамі, які ня можа наважыцца на галоўны крок у сваім жыцьці. Бо нават калі яна і ўспрымае Макбэта як уласнага сына, усё адно (прыгадаем трактоўку Эдыпавага комплексу доктарам Фройдам) маці мусіць спакусіць свайго недарэчнага сына, каб ператварыць яго ў мужчыну.

Наагул, Фройдам прапахлі нават акрываўленыя прасьціны, аб якія героі выцíралі рукі пасьля ўчыненага імі забойства. Каралевіч Малькольм (яшчэ адна ўдалая праца Мікалая Прылуцкага), што эміграваў з краіны праз свой страх патрапіць пад крымінальны перасьлед з палітычных матываў, шчыра іграе такога сабе кепскага хлопчыка, што расказвае даросламу дзядзечку Макдуфу (Вячаслаў Паўлюць) пра свае таемныя ганебныя памкненьні, прычым распуста і зьдзірства між іх — бадай, самыя даравальныя. Макдуф нават змагаецца зь ім, як бацька змагаецца з сынам, што захрас у грахах, каб прымусіць яго адрынуць недахопы і ўзяцца за розум.

Макдуф у выкананьні Паўлюця — антыпод лэдзі Макбэт — Зелянкоўскай. Калі Зелянкоўская (маці) разбэшчвае, дык Макдуф (бацька) вяртае на правільны шлях. Не выпадкова, на наш погляд, у канцы спэктаклю Макдуф, насуперак волі Шэксьпіра, зусім не забівае свайго канчаткова зьдзяцінелага крэўнага ворага Макбэта, што пачаў брахаць бы той зласьлівы маленькі шчанюк, а абяцае пасадзіць яго ў клетку і вазіць па гарадах і вёсках. Такі Макдуф, міласэрны і паблажлівы да крывавых «сынавых» жартачак, настолькі нечаканы, наколькі нечаканыя яго сапраўдныя сьлёзы ў момант, калі ён дазнаецца пра страшэнную разьню, учыненую на загад Макбэта ў ягоным замку. Вячаслаў Паўлюць, цалкам тэхнічны актор на другасных ролях, відавочна заслугоўвае большага. Ва ўсялякім выпадку, пабачыўшы гэтыя сьлёзы Макдуфа, я адчуў, як у мой локаць упіліся пальцы суседкі, што, відавочна, перажывала тое ж, што і я, — пачуцьцё далучанасьці да высокага мастацтва.

Але ж галоўным адкрыцьцём спэктаклю становіцца Макбэт у выкананьні Алега Гарбуза.

Цудоўны камэдыйны і характарны актор, Гарбуз пераканаўчы і ў гэтай адной з самых складаных роляў сусьветнага трагічнага рэпэртуару. Ён надзіва псыхалягічна гнуткі, і калі ў першай сцэне зь вядзьмаркамі мы бачым сьпелага мужчыну (амаль аднагодка ягонага сябра Банка), то далей ён усё больш і больш прыпадабняецца да дзіцяці. Мы прыгадваем, што клясычныя казкі Шарля Пэро і братоў Грым, як правіла, крывавыя і страшныя, што наш уласны дзіцячы сьвет быў да неймавернага цёмным — і квінтэсэнцыя страху абвалілася на нас, калі мы залазілі пад коўдру, накінутую на стол. Было цёмна. Было жахліва. Хацелася паклікаць на дапамогу. І калі, ускокваючы, зьбівалі ўлюбёную маміну вазу, што стаяла на стале і якую мы самі на гэтую няшчасную коўдру і пераставілі (каб маці не здагадалася, што мы — там, зьнізу, унутры, пад сталом...), дык мы прыдумлялі, на каго сьпіхнуць віну...

Дарэчы, пра пошукі дзецьмі вінаватага — іншыя казкі, ужо прачытаныя намі — падрослымі. Пра Карлсана. Пра Піпі Доўгаяпанчоха. Нават пра Віні-Пуха. Толькі тут, на «купалаўскай» сцэне, марна спрабуе



Алег Гарбуз (Макбэт) і Сьвятлана Зелянкоўская (лэдзі Макбэт).

ФОТА З АРХІВУ КУПАЛАЎСКАГА ТЭАТРУ

знайсьці свайго Карлсана такі дарослы Малы, што ўжо голіцца, займаецца сэксам, загадвае забіць няўгоднага яму чалавека і нават здольны сам зьдзейсьніць забойства. І пасьля пакутуе ад учыненага, так што ў дачыненьні да яго можна было б зьмяніць пушкінскі радок:

И все тошнит, и голова кружится,
И Карлсоны кровавые в глазах…

Вось ужо гэтыя дзеці, што разыгрываюць перад намі сваю жорсткую крывавую гульню! Ім усім здаецца, відаць, што яны — яшчэ зусім маленькія, што адказваць за зробленае ім ніколі не давядзецца, таму што адказнасьць за ўчынак узяў на сябе нехта іншы. Мама. Забойцы. Кіраўнік дзяржавы, што аддаў адпаведны загад. І толькі дарослыя людзі здольныя адказваць за зробленыя ўчынкі — і за ўласныя, і за чужыя. Няхай нават нехта ня вытрымае гэтай адказнасьці і засіліцца, як лэдзі Макбэт (слабай выявілася, хоць і швэндалася па сцэне ў жалезных дасьпехах), але затое нехта іншы, як Макдуф, вытрымае, вытрывае ўсё і здолее дамагчыся, каб сьвет — такі жорсткі і няправедны — усё ж такі зьмяніўся.

Дарэчы, і каралевіч Малькольм, што «ўсяго толькі гуляе ў Макбэта», таксама выяўляецца слабым. Невыпадкова, замест таго, каб сесьці на трон і аддзячыць сваім падданым, ён, перапалохаўшыся, сыходзіць ад гэтай адказнасьці ў залю, зьмешваецца з натоўпам гледачоў і зьнікае, пакідаючы зьбянтэжанымі Макдуфа і Роса (Сяргей Чуб), якім ён абавязаны сваёй веліччу.

Многае ў гэтым спрэчным спэктаклі сыгранае (ды і пастаўленае) зусім ужо просталінейна. І сыход забойцаў з залі, і люстэркі, што памнажаюць Банка, які распускаецца ў іх бездані. І нават сівізна, якой у літаральным сэнсе слова фарбуе караля Шатляндыі зласьлівы кон. Але і ў такім выглядзе «Макбэт» Купалаўскага тэатру становіцца несумненнай мастацкай падзеяй. І прымушае пра многае задумацца.

У прыватнасьці, прымушае задумацца мяне як гледача: а ці ня выявіцца шалёны Макбэт Алега Гарбуза надта ўжо падобным да ягонага ж шалёнага Эрыка, якога мне яшчэ давядзецца паглядзець? Дадайце туды ж яшчэ пару каранаваных асобаў, якіх лёгка можа сыграць гэты таленавіты актор: скажам, цара Фёдара Іаанавіча з трагедыі Аляксея К.Талстога, Барыса Гадунова з пушкінскай драмы, Карла IX з трагедыі М.-Ж.Шанье… Ну, відавочна, што знаходкі ператворацца ў штампы і надакучаць гледачу, як і лёгкі флёр сьцярвознасьці, што пераходзіць з ролі ў ролю Сьвятланы Зелянкоўскай.

Увогуле, да наведваньня спэктаклю паводле Стрындбэрга спаць вашаму пакорліваму служку відавочна не давядзецца: Гарбуз зарэзаў мой сон!

...А спэктакль скончыўся нечакана. Ужо пасьля таго, як акторы перасталі выходзіць на сцэну на паклон, і заслона апусьцілася, і гледачы пачалі з шумам пакідаць залю, да фатэлятрону, што адзінотна стаяў (цяжкага, я бачыў некалі такі ў Віскулях!), падышла дзяўчынка.

Яна не пасьпела да кагосьці з выканаўцаў, і чырвоную ружу давялося пакласьці на пусты трон.

І гэта таксама было вельмі сымбалічна.

**Аляксандар Фядута, глядач**

# Невядомыя славяне

Хто яны, славенцы, і як жывуць? Піша **Вацлаў Шаблінскі**.

Што такое Славенія і дзе яна знаходзіцца, узгадае ня кожны беларус. Між тым, як сьцьвярджаюць навукоўцы, славенцы — нашыя вельмі блізкія родзічы. Адзначаюць падабенства нашых моваў, традыцыйнага адзеньня, архітэктуры, нават тапанімікі. У нас ёсьць Мазыр, у славенцаў — Mozirie. Лічыцца, што далёкія продкі славенцаў перад апошняй міграцыяй былі беспасярэднымі суседзямі заходніх, беластоцкіх беларусаў, толькі беларусы пасунуліся на поўнач, а славенцы — на поўдзень.

Хто ж яны — славенцы, гэтыя невядомыя славяне? Продкі славенцаў прыйшлі на тэрыторыю паміж Альпамі і Адрыятыкай у VI стагодзьдзі. Неўзабаве ім давялося сутыкнуцца з ваяўнічымі аварамі. Славенскія князі («кнезы») запрасілі на дапамогу немцаў. У выніку асноўнымі славенскімі землямі — Штырыяй, Карынціяй, Краньяй — завалодала Аўстрыя. Адрыятычнае ўзьбярэжжа адышло да Вэнэцыі. Іншаземнае панаваньне замарудзіла культурнае разьвіцьцё славенцаў.

Аднак, як мяркуецца, менавіта славенскую мову для стварэньня славянскай пісьменнасьці выкарысталі Кірыла й Мятод. Першая друкаваная славенская кніга зьявілася толькі ў 1550 г. Выдаў яе пратэстант Прымаж Трубар. Узорам славенскаму першадрукару служыла Біблія Францішка Скарыны.

Скарыну памятаюць у Славеніі. Ягоная «Малая падарожная кніжыца» захоўваецца ва ўнівэрсытэце Любляны. Адным зь першых скарыназнаўцаў быў славенец Ерэней Капітар (1780—1844). Яму належыць папулярная ў беларускай літаратуры гіпотэза пра сустрэчу і сварку вучонага палачаніна з Марцінам Лютэрам. Гэты сюжэт зрабіўся настолькі распаўсюджаным, што ўжо стаў прадметам пароды (фарс Максіма Клімковіча і Міраслава Адамчыка «Віта брэвіс, або Нагавіцы сьвятога Георгія»).

У выніку палітыкі Габсбургаў на славенскіх землях перамагла Контрарэфармацыя. Але закладзеная пратэстантамі славенская кніжная традыцыя ня зьнікла. Выданьне ў 1768 г. каталіцкім манахам Маркам Пахлінам «Краньскай граматыкі» лічыцца пачаткам нацыянальнага адраджэньня славенцаў. Моцным штуршком гэтаму працэсу стала стварэньне Напалеонам з адабраных у Аўстрыі земляў, так званых Ілірыйскіх правінцыі з цэнтрам у Любляне.

Ілірыйская правінцыя праіснавала нядоўга, але адкрытыя там славенскія школы далі плён. Іх выхаванцам быў нацыянальны паэт Славеніі Францэ Прэшарн (1800—1849). Элегія Прэшарна «Разьвітаньне зь юнацтвам» напісаная на ўзор «Оды да малҐдосьці» песьняра Літвы Адама Міцкевіча.

У параўнаньні зь песьняром Літвы славенскі клясык больш мэлянхалічны. Прычына таму — неразьвітасьць славенскага руху ў параўнаньні з грамадзкай актыўнасьцю на землях былога Вялікага Княства Літоўскага. Тым ня менш, значэньне Прэшарна для Славеніі вялікае. Ягоная творчасьць дапамагла славенцам захаваць сваю нацыянальную сутнасьць, засьцерагчыся ад анямечваньня і панславізму. Палітычнае самавызначэньне славенцаў, аднак, праходзіла павольна.

Да 1918 г. Славенія заставалася часткай Аўстра-Вугорскай імпэрыі, пасьля ўвайшла ў склад Каралеўства Сэрбаў, Харватаў і Славенцаў. Падчас Другой сусьветнай вайны краіну падзялялі Нямеччына, Італія і Вугоршчына. Акупанты гвалтоўна дэпартавалі славенцаў у Нямеччыну, нацыянальнай культурай народу адкрыта пагарджалі. Народ адказаў партызанскай вайной. У Славеніі партызаны ўстанавілі сваю адміністрацыю нават раней, чым у Сэрбіі і Харватыі.

Адным з наступстваў утварэньня сацыялістычнай Югаславіі было наданьне славенскай мове статусу дзяржаўнай. Гэта, дарэчы, была родная мова Ёсіпа Броз Ціта. Дарма што харват па нацыянальнасьці, па-харвацку ён гаварыў з акцэнтам. Ціта хацеў увайсьці ў гісторыю як стваральнік адзінай Славеніі — ад Альпаў да Трыесту. Памятаеце пра «жалезную заслону да Трыесту на Адрыятыцы»? Урэшце, Масква прэтэнзіяў Ціта і славенцаў на Трыест не ўхваліла, што і стала адной з прычын югаслаўска-савецкага разрыву ў 1948 г.

У складзе Югаславіі Славенія была самай заможнай з рэспублік. У адрозьненьне ад харватаў славенцы мелі ўвогуле добрыя стасункі з сэрбамі. Так было, пакуль Слабадан Мілошавіч не зрабіў асновай сваёй палітыкі вялікасэрбскую ідэалёгію. Славенцы адказалі прыняцьцем 21 чэрвеня 1990 г. Дэклярацыі пра сувэрэнітэт. Фэдэральны цэнтар паспрабаваў увесьці ў бунтоўную рэспубліку войскі. На шчасьце, канфлікт аказаўся кароткім і дзён праз дзесяць завершыўся перамогай незалежнікаў. Было б няправільна лічыць сямнаццацігадовую гісторыю незалежнай Славеніі ідылічнай. Такой яна падаецца хіба што на фоне іншых былых югаслаўскіх рэспублік.

Адной з галоўных зьяўляецца праблема так званых «незарэгістраваных грамадзян». На тэрыторыі Славеніі знаходзіцца шмат уцекачоў з суседніх Харватыі, Сэрбіі і Босьніі. Гэтыя людзі дамагаюцца славенскага грамадзянства. Але ўлады краіны, абапіраючыся на жаданьне большасьці карэннага насельніцтва, адмаўляюць ім у гэтым. Такая палітыка не ўхваляецца міжнароднымі праваабарончымі арганізацыямі. Тым ня менш, «незарэгістраваныя грамадзяне» не сьпяшаюцца зьяжджаць зь неласкавай Славеніі ў свае родныя краі, што, безумоўна, гаворыць на карысьць і самой краіны, і яе жыхароў, гэтых «невядомых» славян.



# Паралельная эканоміка Берасьця

### Трыкатажнікі

Кінеш погляд на Берасьце — сталіца трыкатажнікаў. Трыкатажнікі — гэта фірмы, што спэцыялізуюцца на пашыве жаночай вопраткі. Высокаэфэктыўная вытворчасьць паўстала без падтрымкі дзяржавы, і на гэты момант дзяржава зайздросьціць. Адныя словы «найсьвятлейшага» чаго вартыя: «Трэба асушыць гэтую трыкатажную багну». Радавацца трэба, а не зласловіць. Бо гэтыя фірмы даюць неблагі заробак швачкам, мадэльерам, эканамістам, гандлярам. Замест таго, каб заахвоціць і паспрыяць вырабу яшчэ і мужчынскай вопраткі, робіцца наадварот. Каб ніхто ня быў незалежным і заможным, бо забітымі і запалоханымі лёгка кіраваць. Тое ж тычыцца і вырабу мэблі, і сталярак, і тых, хто вырабляе эўравокны і дзьверы, і тартакоў, і іншага.

### Сельская гаспадарка

Ні для каго гэта не таямніца, што прадпрымальныя людзі скупляюць ялавічыну, цяляціну, сьвініну і плоцяць жывымі грашыма, па рынкавых цэнах. Здавалася, добра ўсім. Аж не.

Усё часьцей зьяўляюцца перашкоды: то ты мусіш атрымаць дазвол у сельсавеце на продаж уласнай жывёлы. А табе скажуць: здавай у калгас. Як не, то бык калгасны карову не пакрые, а то аштрафуем (заўжды знойдзецца, за што), ці сена не дамо, ці яшчэ чаго. А адтуль атрымаем грошы, можа, праз тыдзень, а, можа, і праз паўгоду. Ды старыя ў горад не наезьдзяцца, на той самы кірмаш. Дзе кампэнсацыя за нэрвы і прыніжэньні? Нам сьцьвярджаюць, што сельгасэканоміка неэфэктыўная, але ж параўнайце закупкавыя цэны ў селяніна: ялавічына — 1870, цяляціна — 4100, сьвініна — 4500 жывою вагою, малако — 550. І ўсё гэта прадаецца. Хіба нерэнтабэльна?

Бо ж ва ўсіх вышэйпададзеных лічбах няма субсыдыяў — адна свабодная праца! Пра фэрмэраў лепей зусім маўчаць. Энерганосьбіты, вытворчыя прылады, тэхніка — усё праз банк і паперкі. Гэта пры тым, што працавітаму чалавеку на вёсцы да ветру часам бракуе часу схадзіць. Цяпер пра жытло, якое будуецца на вёсцы. Сабекошт яго складае ад 20000 у.а. і вышэй. У дадатак яно нізкай якасьці і патрабуе ўнутранага аздабленьня. Ды і мала прыстасаванае да патрэбаў селяніна. Гэта пры тым, што капіталёвыя цёплыя дамы з усімі хлявамі, аборамі і плотам каштуюць да 5000 у.а. Людзі просяць: дайце нам жывымі грашыма. Але ж не.

За эфэктыўным гаспадараньнем далёка езьдзіць ня трэба. Заедзьце на Століншчыну, Лунінеччыну, у Давыд-Гарадок, Мотыль. Умеюць людзі вырошчваць і насеньне, і агуркі, і памідоры, і кветкі, умеюць і кіўбасы вырабляць, і грошай ня просяць.

### Будматэрыялы

Нашая будаўнічая вытворчасьць прадукуе высокай якасьці матэрыялы: цэмэнт, блёкі, жалезабэтонныя вырабы, дахоўку. І калі яшчэ рост цэнаў на іх абгрунтаваны (вялікая энэргаёмістасьць), то вартасьць спадарожных рэчаў, як, напрыклад, гіпсакардон, лякі, фарбы, розная драбяза, шпалеры, сантэхнічныя прылады, катлы (газавыя і іншыя), нічым не абгрунтаваныя. У той самай Польшчы ўсё гэта таньнейшае ў два разы, пры сусьветных цэнах энэрганосьбітаў і заробках вышэйшых за нашыя ў тры разы.

### Нерухомасьць

Да сумнавядомага ўказу пра зямельныя надзелы, надзел у нас каштаваў ад 2000 —15000 у.а. Яго можна было свабодна набыць. Цяпер вы і не пытайцеся без наяўнасьці як найменей 10000 у.а., гэта пры тым, што законна (паводле ягонага закону) аформіць пакупку амаль немагчыма. Вось добра зрабіў — перамог «спэкуляцыю». Надзелы існуць непрыватызаваныя, прыватызаваныя і такія, што былі набытыя. Калі непрыватызаваныя забіраюцца, і потым яны дзіўным чынам усплываюць, то што рабіць з двума іншымі — невядома. Рэквізаваць і прадаваць супраць волі? Але гэта ўжо ёсьць рэвалюцыйная бальшавіцкая экспрапрыяцыя. Надышоў час камунікацый: вада, каналізацыя, газ, электрычнасьць. Усе яны цягнуцца цэнтралізавана і за дзяржаўны кошт. Усе камунікацыі забудоўнікі зрабілі б за свае грошы.

Будаўніцтва вытворчых плошчаў для прадпрымальнікаў увогуле ператвараецца ў пакутлівае блуканьне. Нават пры наяўнасьці вялікіх сродкаў, ён ня вольны наймаць людзей і плаціць ім. Неабходна наймаць фірму, а ўжо фірма высмакча ўвесь водар. Пераважная большасьць фірмаў запрашае такіх людзей, якім можна як найменей заплаціць. А хто з майстроў пойдзе працаваць за 500.000? Вось і выходзіць: тое, што трэба будаваць за адзін месяц, будуецца шэсьць...

### Будаўніцтва

Вось, нарэшце мы падышлі да прыватнага будаўніцтва. Цана 1 мэтра квадратнага новабуду складае 1000—1200 у.а. (гэта маецца на ўвазе кватэра ў будаўнічах фірмах). Калі ж пакупнік яе атрымае, то ён там ня зможа жыць. Таму што яму неабходна набыць дзьверы, плітку, падлогу, усё гэта ўсталяваць, паправіць хібы, зрабіць столю... Чаму ж гэта добраўпарадкаваны дом на 150 квадратных мэтраў пад ключ каштуе столькі ж, колькі і неаздобленая кватэра ў 100 квадратных мэтраў? А таму што тут прысутнічае вольная якасная праца без пасярэднікаў. І гэта ўсё толькі на мясцовым узроўні. А як наконт усёй краіны?

Прапаную ўладзе ня біць людзей па галаве і руках, і тады мы дамо ўсяму рады. Лідэры апазыцыйных партыяў, апусьціце вочы долу, бо звычайна нацыя жыве штодзённым клопатам. Пабяцайце ім палёгку ў гэтым жыцьці. А грошы ляжаць пад нагамі — не перашкаджайце іх падымаць.

**Ігар Дзенісюк, Берасьце**

Прадаецца

дзейная
**жывёлагадоўчая фэрма**

да 2500 галоў сьвіньняў адначасовай пастаноўкі

Магчымае здаваньне ў арэнду

Разгледзім іншыя прапановы ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва

**Тэл.: 8 017 220 59 45**

## Злачынца ўзяў банк голымі рукамі

У гарадзкім пасёлку Сасновы Бор (Сьветлагоршчына) аддзяленьне «Беларусбанку» знаходзіцца ў двухпавярховым будынку разам з поштай і аптэкай. Пастарунак — на суседняй вуліцы, за 250 м ад банку. 25 лютага ў 13.10, падчас абедзеннага перапынку, хтосьці пагрукаў у дзьверы банку. На пытаньне «Хто там?» невядомы адказаў: «Інкасацыя». Касірка адчыніла, мужчына ў чорнай шапцы з прарэзамі для вачэй ударыў яе ў твар і паваліў на падлогу. Ён прайшоў за перагародку, забраў з касы 9 млн рублёў. Грошы прызначаліся для выплаты заробку работнікам жыльлёва-камунальнага прадпрыемства «Сьветач». Міліцыянты шукалі рабаўніка ў будынку і на вуліцах, але вынікаў гэта не дало. Людзі ня бачылі, каб хтосьці выходзіў з банку. На меркаваньне супрацоўнікаў аддзелу бясьпекі, старшы касір не павінная была адыходзіць ад кропкі трывожнай сыгналізацыі і адчыняць дзьверы.

## Ня сварацца толькі 6% менскіх сем'яў

У Менску 45% маладых сем'яў ацэньваюць свой шлюб як удалы, яшчэ 42,6% — хутчэй як удалы. Але толькі 6% удзельнікаў апытаньня, праведзенага Менскім навукова-дасьледчым інстытутам сацыяльна-эканамічных праблем, адзначылі, што ў іхнай сям'і канфліктаў практычна не бывае. 2/3 апытаных паведамілі, што сямейныя сваркі бываюць, але зазвычай ня маюць сур'ёзнага характару. А крыху болей за 27% сужэнцаў прызналіся ў тым, што ў іхнай сям'і здараюцца вельмі сур'ёзныя сваркі. Асноўнымі прычынамі канфліктаў становяцца сваркі праз дробязі (42,8%), разьмеркаваньне хатніх абавязкаў, цяжкасьці з выхаваньнем дзяцей і ўзаемінаў з бацькамі (прыкладна 40%).



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Масьленка ў Строчыцах — афіцыйнае разьвітаньне зь зімой.**

## Дачнікі сёлета будуць корпацца не ў пустазельлі, а ў паперах

Да кастрычніка садаводам трэба зарэгістраваць правы на ўчасткі ў таварыствах і кааперытывах. Незарэгістраваны ўчастак могуць канфіскаваць. Забіраць участкі мэтаскіравана ніхто ня будзе. Аднак калі вырашаць пракласьці дарогу і ваш участак стане на шляху — дзяржава яго проста канфіскуе і ніякай кампэнсацыі ўладальнік не атрымае.

## Рыхтуецца закон супраць цэнзуры ў інтэрнэце

Эўрапарлямэнт большасьцю галасоў падтрымаў новую ініцыятыву па змаганьні з інтэрнэт-цэнзурай, прапанаваную нідэрляндзкай Народнай партыяй за волю і дэмакратыю. Адпаведна ёй, інтэрнэт-цэнзура ў таталітарных краінах мае афіцыйна разглядацца Эўропай як эканамічны бар'ер. У выпадку ўхвалы ініцыятывы Радай Эўропы, пытаньне аб неабходнасьці скасаваньня інтэрнэт-цэнзуры будзе ўздымацца кожны раз падчас гандлёвых перамоваў з краінамі, якія практыкуюць абмежаваньні на доступ да інфармацыі праз Сеціва.

## Полацкіх бэрэсэмаўцаў адправяць у Сібір

Грамадзкае аб'яднаньне БРСМ фармуе студэнцкія атрады для выкананьня прац па будаўніцтве аўтадарог у Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе Расеі. Атрад фармуецца на конкурснай аснове зь ліку студэнтаў ВНУ, навучэнцаў ССНУ і ПТВ. Выезд плянуецца ў сярэдзіне ліпеня.

## За мяжу па дровы

26 лютага ў раёне пункту пропуску «Мутвіца» пінскімі памежнікамі й супрацоўнікамі органаў унутраных справаў за наўмыснае парушэньне дзяржаўнай мяжы былі затрыманыя двое грамадзян Украіны. Затрыманыя, у якіх знайшлі рулеткі й бэнзапілу, патлумачылі, што парушылі памежнае заканадаўства з мэтай нарыхтоўкі драўніны ў беларускіх лясах.

## У Тайляндзе перакуліўся аўтобус зь беларускімі турыстамі

Аўтобус перавозіў беларускіх і расейскіх турыстаў з курорту Патайі ў Бангкок. Шафёр ня справіўся з кіраваньнем на сьлізкай пасьля дажджу паласе, і аўтобус перакуліўся. Загінулі два жыхары Расеі. У аўтобусе знаходзіліся 38 чалавек, у тым ліку і беларусы. Усе, за выключэньнем дзевяці чалавек, атрымалі траўмы.

## Кітайцы зрабілі самы доўгі мост у сьвеце

У кітайскай правінцыі Чжэзян адкрыты рух па самым доўгім у сьвеце мосьце. Мост Ханчжоўвань мае даўжыню 36 км. Дзякуючы яму, дарога з гораду Шанхаю ў горад Нінба скароціцца на 120 км. Будаўніцтва каштавала 11,8 млрд юаняў ($1,7 млрд).

**СМ; БелаПАН, «Мінск-навіны», АТН, Generation.by, BulletinOnline.org, «Прессбол», telegraf.by, «Народныя навіны Віцебска», sports.ru, xinhua.org**

# Закон бэрэсэмаўскіх джунгляў

Гісторыя са студэнтамі–індусамі гомельскага ўнівэрсытэту, якія запісаліся ў БРСМ, ня можа пакінуць абыякавым. А што калі пасьля вяртаньня на радзіму нехта зь іх, як той Маўглі, згубіцца ў джуглях? Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Зборы зграі ваўкоў каля скалы рады.

**Тыгар Шэр-Хан:** Вольныя ваўкі! Аддайце мне чалавечае дзіця! Гэта мая здабыча!

Частка зграі перабягае на бок Шэр-Хана, скандуючы: «Ён — дзіця чалавека! Нам не патрэбнае дзіця чалавека!»

**Пантэра Багіра:** Таварыш Маўглі, прачніцеся! Таварыш Маўглі, прачніцеся!

**Маўглі** (прачынаючыся): А! Што? Дзе! Прабачце: пасьля доўгіх гадзінаў, праведзеных на лекцыях палітынфармацыі ў гомельскай ВНУ, я часта засынаю на зборах. Што здарылася — мітынг індывідуальных драпежнікаў?

**Мядзьведзь Балу:** Ваўкі зьбіраюцца выключыць цябе са зграі і аддаць Шэр-Хану на ланч.

**Маўглі:** Халера! Напярэдадні гэткага адказнага мерапрыемства — Міжпадвідавага фэстывалю маладняка і апосумаў — даводзіцца займацца такой фігнёй.

**Акела** (правадыр зграі): Ёсьць меркаваньне — выключыць цябе са зграі, паколькі мы і ты — розная крыві.

**Маўглі:** Прыехалі! Акела, што ты нясеш — як можна выключаць сябра арганізацыі Бандэрлогаўскі рэспубліканскі саюз моладзі? І што гэта за тупыя наезды: ты — дзіця чалавека! Ты мяне па сутнасьці пытай: ці я браў удзел у акцыях апазыцыі, ці паважаю я правадыра, цябе канкрэтна, што я думаю наконт сёньняшняй сацыяльна-эканамічнай сытуацыі ў джунглях?

**Акела:** Ну, і што ты думаеш?

**Маўглі:** Дык вось, джунглі знаходзяцца ў стане дынамічнага росту — зірнуць хоць вунь на тую ліяну. Расьце дабрабыт жывёл. Прынятая сацыяльная жыльлёвая праграма: нарадзіў дзесяць шчанюкоў — атрымай нару. Ёсьць, натуральна, асобныя недахопы: яшчэ ня ўсе выходзяць на начное паляваньне з флікерамі. Аднак, у прынцыпе, можна сказаць, што дзякуючы мудрай палітыцы правадыра зграі Акелы, у нас сфармаваліся стабільныя незалежныя джунглі. І абсалютна сьмешна слухаць заявы некаторых прадстаўнікоў сямейства кацiных: «Акела схібіў! Акела схібіў! Зграі патрэбны новы правадыр». Акела ня схібіў, а праводзіў на той момант шматвэктарную палітыку. Яшчэ ёсьць пытаньні?

**Акела:** Быццам, не.

**Маўглі:** Ну і цудоўна. А цяпер — слухаць інструкцыю: разнарадка па зграях, табунах і калёніях на акцыю супраць нелегальнай міграцыі пералётных птушак. Хто ня прыйдзе — разьмяркую ў пустыню Гобі. Гэта кажу Вам я — Маўглі, сябра БРСМ.

## Выйшаў падвойны нумар ARCHE

«Наколькі фашысцкая пуцінская Расея?» Пад такім загалоўкам у сьвежым нумары ARCHE друкуецца артыкул прафэсара паліталёгіі Аляксандра Матыля пра сучасную палітычную сыстэму нашых усходніх суседзяў.




**Мэйнстрымавая ж тэма нумару — сытуацыя вакол справы Аляксандра Зьдзьвіжкова. Аб праявах ісламафобіі ў Беларусі і сьвеце разважаюць Рашэд Чоўдхуры («Пра сваіх і чужых») і Сяргей Богдан («Фараонавы суд, фарысэйства і ўлада»).**

**Удзельнікі круглага стала «Бізнэс, улада і кантроль» аналізуюць студзеньскія пратэсты прадпрымальнікаў, іх узаемадзеяньне з уладнымі структурамі і палітычнай апазыцыяй.**

**«Наколькі фашысцкая пуцінская Расея?» Пад такім загалоўкам у сьвежым нумары ARCHE друкуецца артыкул прафэсара паліталёгіі Аляксандра Матыля пра сучасную палітычную сыстэму нашых усходніх суседзяў. Аўтар прыходзіць да высновы, што Расею Пуціна можна ахарактарызаваць як «нескансалідаваную фашысцкую дзяржаву».**

**Таксама ARCHE №1,2’2008 зьмяшчае ў сабе кнігу польскага гісторыка Вітальда Бярнацкага «Паўстаньне Хмяльніцкага: ваенныя дзеяньні ў Літве ў 1648—49 г.» з ілюстрацыямі і мапамі.**

**Падпіска на ARCHE прымаецца ў любым аддзяленьні «Белпошты» (падпісны індэкс 00345).**

**Таксама яго можна знайсьці ў незалежных распаўсюднікаў і інтэрнэце.**

**АЛЕГ МІНКІН**

# Гэта хіліцца сьвет

***

Па асфальце дажджом секанула зьнянацку,
І па шыбах пустых, раўнадушшам зашклёных,
І калоціцца чорнае гольле шалёна,
І хістаюцца дрэвы ў паклонах вар'яцкіх.

Разьбягаюцца ў цемрадзі сполахі страты
І пад ногі, вярнуўшыся, падаюць ніцма,
І пагрозьліва гмахі, муры, камяніцы
Да мяне нахіляюць бэтонныя латы.

Гэта хіліцца сьвет, у сяродку якога
Зьзяла толькі каханьне... і болей нічога!

***

Здараецца, зімы далёкай подых
На цёплы май дыхне,
І зелень яркую на сушы і на водах
Аблепіць вогкі сьнег.

Няхай у сьветлы дзень твой успаміны
Даходзяць пра мяне,
Як гэты сьнег, што выпаў на хвіліну
І хутка праміне.

ТУМАН

Ад Сухавея бляклых сполахаў,
Які зьвястуе гарачынь,
Накрылася Туману полагам
Ракі натомленая плынь.

Як лёгка яшчэ дыхаць сеначы!
Туман выходзіць зь берагоў,
На дол абрус бяседны сьцелячы
На прыйсьце продкаў і багоў.

ПАЦЯПЛЕНЬНЕ

*М. Т.*

Цяплынь. Вясна. Хоць лютага пачатак.
Унучцы Маі можна без пальчатак
Кранаць усё наўкола прагнай ручкай...
Мне ж, дзедабогу, пільнаваць за ўнучкай.

Кажу, каб штось казаць: «Няма збавеньня —
Глябальнае надходзіць пацяпленьне,
Яно зынчыць агарод і сад,
Замест агрэсту зьвісьне вінаград.

Што? Вінаград? Дык жа яно — жывое!
Вітае Мая ўсе суздром павоі.
А мне ўсьміхацца, тоячы нуду...
Як хараша, што хутка ўжо сыду.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Тэатар «Інжэст». Спэктакль «Пасьля».**

# Энцыклапэдыя Капітана Танакі




Менск - сталіца нашай краіны.



Калісьці Менск выглядаў вось так!





У старажытных кнігах пра Менск упершыню напісалі ў 1067 годзе.

У гэты год адбылася вялікая бітва на рацэ Нямізе. Зараз гэтая рака схаваная пад зямлёй.



Вось герб нашага гораду! Яго можна пабачыць на Ратушы.




http://www.tanakaland.org

Капітан Танака ©

# Людвісарка



Дзе гадуюцца тыя дзяўчаты, якія праз жыцьцё носяць у сабе свой каштоўны дар, даючы сьвету раз-пораз залатыя дарункі? Але ж не залатыя, а зусім наадварот. І ад гэтага захоплівае дух! Калісьці Марына Капілава тлумачыла сваю філязофію бачаньня мэталу: ня сквапнае золата, а перадусім шчодрая латунь, цёплая медзь, мядовыя адценьні ручнога мэталу, які так любіць чалавечы дотык.

У маім успрыняцьці творчасьці Марыны сышліся разам любоў да Менску, да гісторыі, да літаратуры. Бацька Марыны Капілавай, журналіст і пісьменьнік Аркадзь Капілаў, напісаў кнігу «Замкавая 2/7» пра жыхароў даваеннага Менску, пра горад, які па вайне ўжо не адрадзіўся. Вельмі менская кніга. А Марына расла побач. Ды яшчэ значна раней у камяніцах гораду жыхары зацеплівалі масяндзовыя ліхтары, прыбіралі ў шапы цынавы (алавяны) посуд, і вярталіся са сваіх цэхаў людвісары — так называліся рамесьнікі, што мелі справу з агнём, адліваючы і апрацоўваючы рэчы зь медзі, бронзы ды латуні. Усё гэта запісана ў старых кнігах. Адкуль гэта пачула Марына?

А ўсё астатняе — ейны сьвет. У ім няма месца вэрхалу і мітусьні. На ім няма плямаў сытасьці. Часам здаецца, што варта заплюшчыць вочы, і ўсё зьнікне, ці раптам падзьме вецер… Але рухомы матэрыял мае вагу, і таму вобразы затрымліваюцца даўжэй. Яны тут: Прынцэса, Анубіс, Котка, Сіямкі, Багамол, Аматар хурмы…

Абраньніцай мусіць пачувацца кабета, што набудзе сабе ўпрыгожваньні Марыны Капілавай. Гэта ня проста пярсьцёнкі ды завушніцы з бліскучымі каменьчыкамі. Гэта мэтал, на якім вецер пакідае свае адбіткі.

...проста ў свой час яна прачнулася і сышла са сьпіны Адзінарога ў сьвет, пакінуўшы таго ў чаканьні..

Выстава твораў мастачкі і скульптаркі Марыны Капілавай «Сёе-тое» цяпер і **да 20 сакавіка ў галерэі «Падземка» (пр.Незалежнасьці, 43)**. Пасьпяшайцеся. Яны чакаюць.

**Вольга Бабкова**

## ВЫСТАВЫ

### 10 гадоў з аднаго акна

Мастак, музыка, рэжысэр **Андрэй Плясанаў прэзэнтуе на сядзібе БНФ (вул.Варвашэні, 8)** нізку фатаздымкаў, зробленых з акна ўласнай кватэры, што на рагу вул.Янкі Купалы і праспэкта Незалежнасьці.

Сваімі ўражаньнямі прыйдуць падзяліцца лідэр гурту «Гарадзкія» **Піт Паўлаў**, **Ігар Варашкевіч** з «Крамы» ды блюзмэн **Юры Несьцярэнка**. Баявая тэхніка на цэнтральным праспэкце сталіцы, шматтысячныя калёны маршаў апазыцыі, кардоны міліцыі… Фотавыстава прымеркаваная да 90-годзьдзя Беларускай Народнай Рэспублікі.

### Слуцкае Эвангельле

У Нацыянальнай бібліятэцы да траўня працуе **выстава «Асьветнік з роду Астроскіх»** і **да 15 сакавіка** прэзэнтуецца электроннае выданьне «Слуцкае Эвангельле — беларускі рукапіс XVI ст.». Абодва мерапрыемствы прысьвечаныя 400-годзьдзю з дня сьмерці Канстанціна Астроскага. На выставе «Асьветнік з роду Астроскіх» дэманструюцца выданьні к.XIX—п.XX ст., прысьвечаныя гісторыі княжага роду; старажытныя кнігі, надрукаваныя ў Астроскай і іншых друкарнях XVI—XVIII стст.

12 сакавіка · Менск

19.00 · R-Club

N.R.M.

·разьвітальны канцэрт·

р а з ь в і т в а е м с я   з ь   з і м о й

вул. Сурганава, 26

## СПОРТ

### Пасьля Дня Волі, усе — на футбол

Стаў вядомы час правядзеньня таварыскага матчу між зборнымі Беларусі і Турцыі. Матч пройдзе **26 сакавіка на менскім стадыёне «Дынама». Пачатак а 20-й.**

## КАНЦЭРТЫ

### Эдуард Акулін і Алесь Камоцкі

**16 сакавіка а 18-й у малой залі к/з «Менск»** — супольны канцэрт бардаў Эдуарда Акуліна і Алеся Камоцкага. Квіткі: 10000—18000. Даведкі: (029) 649–08–88, (029) 766–24–25. Каса: 328–66–38

### Metallection-Fest

**У клюбе «Рэактар» (Веры Харужай, 29) 7 сакавіка** — Metallection-Fest. **Пачатак а 18-й.** У мэтал-шоў возьмуць удзел гурты **Asguard**, **Imprudence**, **Soncavarot**, **Soulsides**, **Partyzone**. Т.: 288–61–60, (029) 766–24–25, (029) 649–08–88

### BLAST W!NTER SHOW FESTIVAL

Таксама **ў «Рэактары»**, і таксама для аматараў цяжкай музыкі **13 сакавіка** — BLAST W!NTER SHOW FESTIVAL з удзелам **Diary of dreams** (Нямеччына), **Prophetic dream** (Беларусь), **Diffuzion** (Беларусь), **Cold in may** (Беларусь), **Тэорыя** (Беларусь). **Пачатак а 17-й.** Квіткі: 40000—70000. Т.: (029) 336–47–69

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**7 (пт)** — «Слуга двух гаспадароў»
**9 (ндз)** — «Паўлінка»
**15 (сб), 16 (ндз)** — «Дзеці Ванюшына»
*ранішія спэктаклі*
**9 (ндз)** — «Паўлінка»
*малая сцэна*
**9 (ндз)** — «Балада пра каханьне»




## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Бязьлітаснасьць»

**Бязьлітаснасьць** (Жестокость)

Расея, 2007, каляровы, 90 хв.

**Рэжысэрка:** Марына Любакова

**Жанр:** Драма, напарніцкае кіно з элемэнтамі нуару

**Адзнака:** 7 (з 10)

Дзяўчынка Віка (Ганна Бегунова) зь няпоўнай сям'і забаўляецца тым, што з даху хрушчоўкі фатаграфуе суседзкія вокны. Аднойчы ў аб'ектыў трапляе сцэна залётаў жанатага кавалера да палюбоўніцы Зоі (Рэната Ліцьвінава). Калі Віка спрабуе шантажаваць чужаложніка, то церпіць паразу. Тады дзяўчынка знаходзіць кінутую жанчыну — і ўцягвае яе ў помсту…

Карціна Марыны Любаковай — вострая псыхалягічная драма пра злое яршыстае пакаленьне, зайздрасьць, «гендэрную» вайну, лютасьць і спачуваньне — запакаваная ў трагікамічную абгортку напарніцкага кіно й лёгкага нуару.

Зоя і Віка — «Тэльма і Луіза» расейскіх джунгляў, якія крадуць машыну, паляць дом (!) і рабуюць банк (!!). Рэната Ліцьвінава на высокіх абцасах датклівa-нэрвова ўцякае ад пераследнікаў — гэта яшчэ тое відовішча.

Стужка — гімн ваяўнічага расейскага фэмінізму, пашлюбаванага з самотай і экзыстэнцыйнай тугой у пацешлівых інтанацыях. Мужчыны — супастаты, нягоднікі, ёлупні; у лепшым выпадку — бісэксуалы, якіх можна раскруціць на грошы. «Вы не ўяўляеце, якая гэта цяжкая праца — жыць з мужчынам», — скардзіцца гераіня Ліцьвінавай чарговаму кавалеру, каб з далікатнасьцю заляпіць яму салатам у фізію.

Парушыць усе нормы, скандаліць, крычаць ва ўсё горла — і трапіць у пастку бязьлітаснасьці, якая даўно чакае зручнага моманту.

Дэбютная стужка Марыны Любаковай, пастаўленая паводле сцэнару Дзяніса Радзіміна і пад прадусарствам Паўла Лунгіна, — гэта праўда характараў і эмоцый.

Гэта фільм, які ненавязьліва, але трапна выкарыстоўвае жанравыя схемы й кінаспасылкі — ад «Акна ў двор» Хічкока да амэрыканскіх «дарожных» і «напарніцкіх» фільмаў.

Гэта добрае кіно — і, нарэшце! — расейская стужка, якую сапраўды можна глядзець.

Глядзець з сумам і асалодаю.

**Андрэй Расінскі**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Зь вясной, дзяўчаты!**

## КАЛІ Б...




МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁПІКА УШКІНА

**...улады хацелі рэабілітавацца за масавыя крымінальныя справы супраць прадпрымальнікаў.**

**Прадстаўнік МЗС:** Дзякуй за пытаньне. Так, у нас ёсьць палітычныя вязьні. Адпаведна Ўказу «Аб пераходзе з ІП у статус палітычных вязьняў», ствараецца новая катэгорыя прадпрымальнікаў. Поўная свабода бізнэсу: хуткая рэгістрацыя, ніякіх падаткаў і галоўнае — ніхто не патрабуе даваць грошы на будаўніцтва лядовых палацаў і бібліятэк...

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Пецярбург.** Тут закончыў жыцьцё сваё інжынэр Бак, каторы выдаваў за свае грошы газэту «Речь». Бак радзіўся на Беларусі, у Сьвянцянах; на выбарах у Думу ён быў выбаршчыкам у губэрні ад Сьвянцян і быў у хаўрусе з мужыкамі проці памешчыкаў.

**«Наша Ніва». №9. 1908**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ЖЫТЛО

**Маладая беларускамоўная сям'я** зь дзіцем 6 гадоў здыме адносна таннае прыстойнае жытло ў Менску альбо пад Менскам (каб часта хадзілі электрацыя ці аўтобус). Разглядаюцца ЎСЕ варыянты. Т.:(029) 198–32–51

**Маладая** беларуская сям'я здыме кватэру ў Менску. Т.: (029) 664–66–27 (Алена), (029) 671–07–15 (Андрэй)

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** «Шчучынскі раён» 9 сакавіка (нядзеля) па маршруце: Менск—Жалудок—Ражанка—Шчучын—Вялікае Мажэйкава—Васілішкі—Лябёдка Іванаўская—Менск. 14—17 сакавіка — «Падольскія Фартэцыі»: Камянец–Падольскі—Хоцін—Меджыбож. Т.: 292–54–58; (029) 622–57–20; (029) 509–12–16

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 05.03.2008.

Замова № 1244.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.